

РАМОНТ КАПІТАЛЬНЫ, АЛЕ ЗАЦЯЖНЫ...

МС

РАТУЮЧЫ ІНШЫХ, РАТУЕШСЯ САМ

5




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

3 КРАСАВІКА 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 65 (29179)


9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVпраграма

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір СЯМАШКА, пасол Беларусі ў Расіі:**

*«Безумоўна, большую частку з патрабаванага аб'ёму нафты мы будзем атрымліваць з Расіі, паколькі тут немалаважную ролю іграюць і зручнасць лагістыкі, і тэхналагічная арыентацыя беларускіх нафтаперапрацоўчых заводаў на перапрацоўку нафты гатунку Urals. Але разам з тым кіраўніцтву канцэрна «Белнафтахім» пастаўлена задача нарошчваць аб'ёмы ўласнай здабычы нафты з праверанымі часам замежнымі партнёрамі і шукаць альтэрнатыўныя крыніцы пастаўкі нафты, каб надалей не трапляць у цяжкія сітуацыі».*

# Эксклюзіў ад «Даспехаў»



**Кіраўнік швейнага прадпрыемства Сяргей ВЕЛІМОВІЧ *(злева)* са сваімі работнікамі Анатолем КУЛІКОЎСКІМ і Людмілай ЛАНЮК аглядаюць новыя эксклюзіўныя вырабы для браслаўчан.**

Мінскае швейнае прадпрыемства «Даспехі» на працягу дваццаці гадоў «апранае» ў свае вырабы аматараў рыбалкі і паляўнічых, супрацоўнікаў леса-паркавых гаспадарак, а таксама інспектараў аддзелаў ахоўы жывёльнага і расліннага свету. Гэтымі днямі краўцы выконваюць заказ для Браслаўскага нацыянальнага парку — шыюць курткі і касцюмы ўласных мадэляў і пакрою для егераў прыродаахоўнай установы.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Красавік у Беларусі чакаецца цяплейшы, чым звычайна.**
- Тэрмін падачы заяў у ваенныя навучальныя ўстановы працягнуты да 8 мая.
- **Пуцін падоўжыў нерабочы рэжым у Расіі да 30 красавіка з-за каранавіруса.**
- Маршруты грамадскага транспарту Мінска змяняцца на час трэніровак роты ганаровай варты. Змены будуць дзейнічаць 6, 9, 13, 16, 20, 23, 27 і 30 красавіка з 21.00 да 23.00.
- **Савет ЕЭК вынесе на міждзяржсавет сумесныя меры ва ўмовах распаўсюджвання COVID-19.**
- На другім энергаблоку БелАЭС пачалася падача напружання на ўласныя патрэбы.
- **НББ з 6 красавіка пачне падмацоўваць банкі абноўленымі банкнотамі Br20 і Br50.**


ISSN 1990 - 763X


# ЗАКОНЫ ПАВІННЫ ПРАЦАВАЦЬ ЭФЕКТЫЎНА

*Выступленне старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Н. І. Качанавай на адкрыцці другой сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання*



Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Паважаныя запрошаныя!

Сёння пачынае сваю работу другая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання. 2020 год азнаменаваны шэрагам знакавых падзей. Мы адзначаем **75-годдзе Вялікай Перамогі —** свята, якое стала сімвалам свабоды і незалежнасці, блізкае кожнай беларускай сям'і. Захаванне гістарычнай памяці пра вайну, клопат пра ветэранаў, патрыятычнае выхаванне моладзі — найважнейшыя кірункі работы членаў Савета Рэспублікі, якія неабходна развіваць, напаўняць новымі праектамі.

Ключавой падзеяй у палітычным жыцці краіны стануць **прэзідэнцкія выбары,** бо мы вызначаем нашу будучыню. Гэта адказны перыяд для ўсіх органаў улады, і нам неабходна прыняць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні гэтай важнай палітычнай кампаніі. Выбары павінны прайсці на высокім арганізацыйным узроўні, у поўнай адпаведнасці з Канстытуцыяй і дзеючым выбарчым заканадаўствам.


СТАР. 3


# ІСЦІ Ў НАГУ З ЧАСАМ І ПРАЦАВАЦЬ НА ПЕРСПЕКТЫВУ

*Выступленне старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. П. Андрэйчанкі на адкрыцці другой сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання*



Паважаныя дэпутаты і запрошаныя!

Пачынае сваю работу другая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання.

Галоўнай палітычнай падзеяй у гэты перыяд стане Пасланне кіраўніка дзяржавы беларускаму народу і парламенту, ключавыя палажэнні якога будуць пакладзены ў аснову фарміравання стратэгіі развіцця Беларусі ў новым пяцігоддзі.

Гэтая стратэгія павінна не толькі насіць антыкрызісны характар, але і працаваць на перспектыву, на эфектыўнае выкарыстанне галоўнай нашай канкурэнтнай перавагі — чалавечага капіталу і тых галін эканомікі, якія стануць драйверамі ўпэўненага развіцця краіны ў XXI стагоддзі.

Безумоўна, сітуацыя на сусветных рынках на фоне нафтавых войнаў і ўспышкі каранавіруса складваецца няпростая. У многіх краінах спыняюцца прадпрыемствы і цэлыя галіны, падае дзелавая актыўнасць.


СТАР. 4

З першых вуснаў

# «Пасля пандэміі свет будзе іншы. Другое пытанне — дзе наша будзе месца ў гэтым свеце»

**Падчас сусветнага змагання з нябачным ворагам, сучаснікамі якога мы ўсе з'яўляемся, важна не страціць арыенціры, не забыцца пра каштоўнасці, без якіх ніякая перамога немагчымая. І адной з такіх з'яўляецца памяць. Чалавецтва без памяці рызыкуе страціць само сябе. Таму нам так важна не забыцца, што 2020 год у першую чаргу — год 75-годдзя Перамогі ў Другой сусветнай вайне, той, якую мы ведаем як Вялікую Айчынную, у якой нашы дзяды і прадзеды ахвяравалі сваімі жыццямі дзеля нашага шчаслівага жыцця.**

**Таму цалкам лагічна, што ў гэты год розныя СМІ ажыццяўляюць праекты, закліканыя яшчэ раз нагадаць пра неабходнасць памятаць пра Перамогу ў вайне, якая скончылася некалькі пакаленняў таму. Інтэрв'ю Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «МИР», якое выйдзе ў эфір сёння, — якраз у рамках такога праекта. Галоўная тэма — 75 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Яшчэ адна нагода для гутаркі з беларускім лідарам — Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі, які адзначаецца 2 красавіка. Акрамя таго, журналісты МТРК «МИР» спыталі пра сучасныя выклікі для інтэграцыйных аб'яднанняў на постсавецкай прасторы, пра перспектывы вяртання Украіны ў СНД і пра ўмовы трывалага міру на тэрыторыі краіны-суседкі. Прыводзім некалькі фрагментаў размовы.**


Фота БелТА.

## «Мы не супраць адзінай валюты, але толькі гэта павінна быць нейтральная валюта»

На пытанне, як Прэзідэнт бачыць развіццё Саюзнай дзяржавы з улікам усіх наяўных нюансаў, Аляксандр Лукашэнка адказаў: «У нас ёсць дамова аб стварэнні Саюзнай дзяржавы. Ні ад аднаго пункта гэтай дамовы мы не адмаўляемся. Нават возьмем самы сур'ёзны, які сёння абмяркоўваецца, — адзіная валюта. Мы не супраць адзінай валюты, але толькі гэта павінна быць нейтральная валюта — не беларускі рубель, не расійскі».

На думку Прэзідэнта, галоўнае ў гэтым пытанні — дзе будзе эмісійны цэнтр. «І нават не дзе, а хто будзе кіраваць эмісійным цэнтрам. Гэта будзе на роўных або, паколькі Расія вялікая, яна будзе кіраваць сваім рублём, а мы свой ліквідуем і да іх далучымся? — задаўся пытаннем Аляксандр Лукашэнка. — Мы гэта ўжо праходзілі ў першыя гады пасля распаду Савецкага Саюза. Калі нас проста выкінулі з рублёвай зоны і ў рэшце рэшт мы засталіся з савецкімі рублямі, яны (Расія. — «**Зв.**») увялі расійскі рубель, а мы потым малявалі «зайчыкі». Я не хачу гэта паўтараць. Гэта па-першае. А, па-другое, дзе ж тут тады будзе наш суверэнітэт?»

Кіраўнік дзяржавы яшчэ раз падкрэсліў: меркавалася, што будуць створаны роўныя ўмовы для грамадзян і прадпрыемстваў. «Калі Расія сёння, адмовіўшыся ад гэтых імперскіх памкненняў (мы — вялікія, а вы — малыя), гатовая на гэта, давайце весці перагаворы, давайце будзем вызначацца», — сказаў Лукашэнка.

«Таму дагавор існуе. І мы ніколі ад яго не адмаўляліся. Мы гатовыя ісці па гэтай дамове, але ***жалезабетонны прынцып — роўныя ўмовы для людзей, прадпрыемстваў***. Цяпер усё парушана, а каранавірус парушыў і апошняе, самае галоўнае, — роўныя ўмовы для людзей», — лічыць Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што калі Расіі трэба было нешта зрабіць, то варта было хоць бы параіцца, папярэдзіць беларускі бок аб закрыцці граніц. «Я разумею, калі б там паўстала нейкая жудасная сітуацыя і трэба было тэрмінова прыняць меры. Але логікі не было тады. У Беларусі сітуацыя была не горшая, чым у Расіі, — значна лепшая. Я настойваю, што і сёння не горшая. Навошта адразаць ад гэтай Саюзнай дзяржавы тую асноўную частку, дзе няма праблем. І ў той жа час яны ўнутры краіны (а Расія велізарная) не падзялілі на часткі, каб перакрыць рух людзей і носьбітаў каранавіруса. І як наконт формулы «сябар пазнаецца ў бядзе»? — задаўся пытаннем кіраўнік дзяржавы.

## «Я ўяўляю, што будзе з намі, калі мы спынімся»

Пытанне «Як пераадолець эканамічныя праблемы, якія ўзніклі з-за эпідэміі?», якое задаў журналіст, Прэзідэнт перайначыў: «Што будзе пасля пандэміі?»:

***— І многія задаюцца пытаннем, што будзе пасля пандэміі. І чаму я настойваю, каб працавала вытворчасць, чаму я так хвалююся, каб людзі жылі сваім жыццём? Таму што я ўяўляю, што будзе з намі пасля гэтай пандэміі, калі мы спынімся.***

Расія вытрымае, упэўнены кіраўнік Беларусі, бо ў іх ёсць прыродныя рэсурсы, у Кітая — магутная эканоміка, у ЗША — друкарскі станок долараў.

«Нас падштурхнулі да таго, што мы павінны спыніцца і сядзець, праесці тыя мізэрныя запасы, якія ў нас ёсць. Нават у Расіі нельга сказаць, што велізарныя яны (запасы. — «**Зв.**») валютныя, — тлумачыць Прэзідэнт. — І тады да нас прыйдуць тыя, хто на нагах, тыя, хто надрукаваў 10 працэнтаў ВУП — вось вам трохі, але вы будзеце рабіць, што мы скажам. Вось так будзе перадзелены свет».

Гэтае пытанне — і што будзе далей — сёння найбольш хвалюе Прэзідэнта.

«Усе ўжо на пытанне адказваюць, што пасля пандэміі свет будзе іншы. Дакладна, і я з гэтым згодны. Другое пытанне — дзе наша будзе месца ў гэтым свеце?» — сказаў лідар краіны.

І такое пытанне ўзнікне для ўсіх краін.

«Баюся, каб нас не перадзялілі без вайны», — завяршыў Аляксандр Лукашэнка.

«Калі б ва ўсіх было так, як у Беларусі, тады б не было такіх праблем»

Размова пра каранавірус зайшла яшчэ да пачатку інтэрв'ю. Прэзідэнт пракаментаваў заявы некаторых лідараў суседніх краін, што Беларусь «не як усе» рэагуе на праблему.

«Слухайце, калі б ***ва ўсіх было так, як у Беларусі, па барацьбе з гэтымі віруснымі захворваннямі і каб як у нас не забываліся, што ёсць і сардэчнікі, і анкалогія, ёсць траўматалогія, ёсць проста пнеўманія, гэта сезонная хвароба вельмі моцная, тады б не было такіх праблем***, — сказаў Прэзідэнт. — Мы не можам не трымаць яго (каранавірус. — «**Зв.**») у галаве. Таму што скрыню ўключыў — каранавірус, прас уключыў — каранавірус, чайнік уключыў — каранавірус».

Прэзідэнту дакладваюць па кожным выпадку смерці ад пнеўманіі. «Іх чацвёра ўсяго, памерлых ад пнеўманіі, дзе ўскладненні даў каранавірус, — праінфармаваў ён. — Любы вірус можа ўскладніць хранічныя захворванні, і навошта гвалтам крычаць? Што атрымалася, быццам мы нешта хаваем. Смерць чалавека ніколі не схаваеш, таму што сваякі кожнага атрымліваюць даведку ў загсе».

Па чацвёртым выпадку зараз яшчэ ўдакладняюць, ці быў у памерлага каранавірус. Звесткі з загсаў па смяротнасці Прэзідэнт абяцае паказаць журналістам.

«За два месяцы — студзень, люты — у нас адмоўная дынаміка смяротнасці людзей (у параўнанні з мінулым годам. — «**Зв.**»). Пры такой пандэміі ў нас памяншэнне смяротнасці. Я не кажу пра тых, хто захварэў, заразіў і іншых, — я кажу аб людзях, якія адышлі ў іншы свет. У нас адмоўная дынаміка», — падкрэсліў Прэзідэнт.

## Занадта строгія і бяздумныя меры могуць пагоршыць сітуацыю

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што не крытыкуе кіраўніцтва іншых краін за меры, якія тыя прымаюць, бо не ведае, якая там абстаноўка. Разам з тым для Беларусі ён лічыць падобныя меры залішнімі.

«Але ўяві: мы Мінск сёння ізалявалі і ўсіх закрылі ў кватэрах. Як адрэагуюць нашы беларусы? У нас сітуацыі няма, каб такія меры прымаць. І дай Бог, каб гэтай сітуацыі ў нас не было», — патлумачыў ён, дадаўшы, што ўвесці такія меры ў Мінску — не праблема, гэта магчыма зрабіць на працягу сутак. «***Гэта зусім не пытанне, але ўва што гэта выльецца?***», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

Арганізм павінен змагацца з інфекцыямі. Для гэтага, па словах беларускага лідара, трэба часцей бываць на свежым паветры, а такама займацца спортам і добра харчавацца.

«Учора адзін вельмі разумны расіянін, я паслухаў, кажа: трэба фізічна змагацца з ім. Я думаю: як жа фізічна? Трэба сябе засцерагчы ад небяспекі. Спортам займацца трэба і на свежым паветры быць. Трэба лёгкім дапамагчы. Мы, кажа, на дыеце сядзелі, а патрэбна тлустая ежа. І я таксама абмяжоўваў сябе. А сметанковае масла трэба зараз есці, аказваецца, тлушч дапамагае лёгкім змагацца з вірусамі. Калі спецыяліст, вучоны кажа, напэўна, не дурань. Вось з вопыту свайго я яго ў гэтым падтрымліваю», — дадаў Прэзідэнт.

## «У нас каля трох тысяч апаратаў ШВЛ»

«Калі ўжо прыйдзе такі момант, калі нам трэба недзе тушыць пажар, мы яго будзем тушыць, і значна больш эфектыўна, чым тыя, хто нас зараз крытыкуе», — паабяцаў Аляксандр Лукашэнка, маючы на ўвазе нядаўнія выказванні літоўскага прэзідэнта.

«Слухай, ён заклапаціўся беларускім вірусам! Слухай, ты сваім вірусам займіся, у цябе там куча пытанняў! Ён яшчэ папракае, што, напэўна, беларусы не ўсё даюць, не пра ўсё інфармуюць», — абурыўся кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт праінфармаваны пра стан усіх людзей, якія падключаны да апаратаў штучнай вентыляцыі лёгкіх. Такіх на раніцу чацвярга было 11 чалавек. Паводле яго слоў, сярод іх на момант гутаркі «цяжкіх» не было.

«У нас каля трох тысяч апаратаў ШВЛ, плюс наркозна-дыхальныя апараты можна выкарыстоўваць у крайнім выпадку», — адзначыў Прэзідэнт.

Сістэма аховы здароўя, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, абавязана зберагчы людзей ад небяспекі. «***Урачы павінны лячыць людзей — гэта маё жорсткае патрабаванне.*** Не хадзіць і закрываць там установы, нешта адмяняць — гэта справа ўлады. Ты прыйдзі, дакажы, што гэта трэба, а ўлада прыме рашэнне. А ты не адхіляйся, давай, лячы!» — паўтарыў сваю ўстаноўку Прэзідэнт.

Беларускі лідар зноў успомніў сумны выпадак у Віцебску, калі каранавірусам заразіліся больш чым 10 урачоў.

«Як груба кажу, «у піжамах» бралі гэтыя тэсты. Кажуць: каранавірус. Няважна, што. Ты ж урач, хоць маску надзень у такі момант, ну рэспіратар надзень. Ёсць жа гэтыя касцюмы, бахілы, пальчаткі, акуляры — надзень гэта», — апісаў прычыны заражэння віцебскіх урачоў Прэзідэнт.

Пры гэтым ён падзякаваў медыкам за іх працу і праінфармаваў, што іх жыцці і здароўе ў бяспецы.

На Віцебшчыну быў накіраваны міністр аховы здароўя са спецыялістамі, а старшыні аблвыканкама загадана дапамагаць ім. Гэта дазволіла на працягу трох дзён узяць сітуацыю пад кантроль, кажа Прэзідэнт.

«Ужо сёння на 100 чалавек колькасць агульных захворванняў у Віцебскай вобласці знізілася, — аргументаваў Аляксандр Лукашэнка. — Я кажу, што малю Бога, каб мы, як зараз (у такім жа стане. — «**Зв.**»), прайшлі да Вялікадня хоць бы гэтае плато, як уражы кажуць, пік гэты, і дай Бог, каб удалося знізіць».

## «Мы не вырашаем праз каранавірус ніякія палітычныя пытанні»

Безумоўна, людзі будуць хварэць, у тым ліку і на каранавірус, і на іншыя небяспечныя інфекцыі, як гэта здарылася ўжо з адным пацыентам, у якога, акрамя новага віруса, выявілі экзатычны небяспечны грып.

«У яго быў букет. І малайцы ўрачы — вось за што я іх хвалю зараз (каб не перахваліць): што яны з камбінацый лекаў розных знайшлі такую, што змагла паставіць чалавека на ногі. Хоць ён быў у найцяжэйшым стане», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

«***Казаць, што ў Беларусі ўсё ціха і спакойна — глупства поўнае. Проста мы не панікуем, мы займаемся кожны сваёй справай. Мы не вырашаем праз каранавірус ніякія палітычныя пытанні***, — заявіў ён. — Хоць у нас палітычны год. Ведаеце, калі шчыра, я б мог сёння ўвесці надзвычайнае становішча (патрулі па вуліцах, усе сядзяць) і паказаць, які я круты хлопец, перад прэзідэнцкімі выбарамі, што магу ўсё ўзяць пад кантроль. Не дай Бог, каб нам рэальна прыйшлося жыць у такой сітуацыі, калі давядзецца абмяжоўваць чалавеку магчымасць хадзіць па вуліцах, вывесці свайго... не сабаку, а дзіця некуды. Не дай Бог! І я ў гэтыя гульні гуляць не хачу!»

Прэзідэнт паўтарыў, што мы будзем змагацца з любой хваробай, таму ён не ставіць асобна каранавірус.

«З любой хваробай трэба змагацца, — акцэнтаваў кіраўнік дзяржавы. — Бо чалавечае жыццё, калі яно знікне, не важна, ад чаго, яго проста не стане. Вось у чым пытанне».

Кіраўнік дзяржавы паведаміў, што ў аўторак будзе выніковая нарада па шэрагу пытанняў, на якой абнародуюць статыстыку.

«Мы нічога абсалютна не хаваем. Ні-чо-га, — раздзяліў слова па складах Прэзідэнт. — Але галоўнае, што нас выратавала ад гэтага вар'яцтва (за што нас зараз крытыкуюць), — мы на граніцах пачалі ўсіх чысціць, мыць, мацаць, тэставаць. Бо ўбачылі, што гэтую заразу нам завозяць збоку. У нас яе ў прынцыпе быць не магло і не павінна».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Марыя ДАДАЛКА.**

## «Эканоміка — пытанне нумар адзін»

Пра гэта Аляксандр Лукашэнка заявіў, прымаючы з дакладам старшыню Дзяржаўнага мытнага камітэта Юрыя Сянько

**«Граніца — гэта вялікі паказчык і лакмусавая паперка функцыянавання эканомікі. Таму літаральна некалькі слоў. Я інфармаваны аб перамяшчэннях вялікагрузных аўтамабіляў, аб перамяшчэннях праз граніцу ў той і зваротны бок і грамадзян Беларусі, і іншых грамадзян», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.**

Прэзідэнт падкрэсліў, што стан спраў у беларускай эканоміцы — гэта найважнейшае для яго пытанне, паколькі ***вірусы прыходзяць і адыходзяць, а жыццё будзе працягвацца». «І вось якім будзе гэтае жыццё, шмат у чым залежыць ад таго, як мы працуем сёння.*** Таму эканоміка для мяне — пытанне нумар адзін. Усё больш гэтым займаюся цяпер», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Таксама Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, як складваецца абстаноўка ў калектыве мытнага камітэта, ці ёсць сярод супрацоўнікаў інфіцыраваныя каранавірусам.

Як расказаў Юрый Сянько, за студзень—сакавік транзіт тавараў праз беларускую граніцу нават павялічыўся ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам. «Каля 8-9 працэнтаў рост імпарту і транзіту на тэрыторыю Расіі і далей. Гэта значыць, ідзём у плюс з пункту гледжання колькасці машын, якія транзітуюць па тэрыторыі нашай краіны», — адзначыў старшыня камітэта.

Ён расказаў, што цяпер на мытні ў першачарговым парадку афармляюць грузы з хуткапсавальнымі прадуктамі харчавання і таварамі першай неабходнасці. «Такая тэхнічная магчымасць у нас ёсць», — дадаў Юрый Сянько.

Транзіт па тэрыторыі нашай краіны за першыя тры месяцы вырас з 366 тысяч партый тавараў, якія перавезлі ў першым квартале летась, да 400 тысяч сёлета, — удакладніў для журналістаў лічбу, якая была прадстаўлена кіраўніку дзяржавы, Юрый Сянько.

«Гандлёвы абарот працуе, імпарт на тэрыторыю Беларусі павялічыўся на чатыры працэнты, гэта адлюстравалася на плацяжах, якія мытная служба збірае ў бюджэт краіны, — дадаў ён. — Што датычыцца сітуацыі на пагранічных пунктах мытнага афармлення, было даложана пра тое, што ў сувязі з ініцыятывай сумежных бакоў аб закрыцці асобных пунктаў пропуску (пры гэтым гэта былі невялікія пункты пропуску) мы са свайго боку перавялі спецыялістаў, якія працавалі на гэтых участках, на больш буйныя ўчасткі, дзе ўзмацнілі працоўныя змены, каб пераадольваць плыні грузаў апрацоўваць і выключаць затрымкі».

Юрый Сянько паведаміў кіраўніку дзяржавы пра стварэнне «зялёных» калідораў для першачарговага афармлення тавару, які ўключаны Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання ў адпаведны пералік.

Старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта таксама паведаміў, што пакуль ніводны яго падначалены не захварэў на каранавірус, а захваральнасць асабовага складу агульнымі хваробамі знаходзіцца на ўзроўні мінулага года.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Блізкая ўлада

## АГУЧВАЙЦЕ ПРАБЛЕМЫ

**Традыцыйна, па суботах, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, папяратворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 4 красавіка, з 9.00 да 12.00 правядуць:

- кіраўнік спраў Брэсцкага аблвыканкама Георгій Мікалаевіч ХВАЛЬКО. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- кіраўнік спраў Гомельскага аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар Георгіевіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;
- кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч КРУЧАНАЎ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- старшыня Мінскага гарвыканкама Анатоль Аляксандравіч СІВАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

# ЗАКОНЫ ПАВІННЫ ПРАЦАВАЦЬ ЭФЕКТЫЎНА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Сёлета **завяршаецца пяцігодка.** 17 сакавіка на нарадзе ў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі падведзены вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны за 2019 год, разгледжаны прыярытэты і асноўныя кірункі на сярэднетэрміновы перыяд. Мэтавая задача — устойлівы эканамічны рост з тэмпамі **3—4 працэнты ў год.** Для гэтага неабходна:

- забяспечыць эфектыўную работу **кожнага прадпрыемства,** раўнамернае і ўстойлівае развіццё **ўсіх рэгіёнаў краіны;**

- стварыць умовы для прыцягнення замежных і ўнутраных **інвестыцый;**

- нарошчваць экспарт, у тым ліку на новыя рынкі збыту.

Безумоўны прыярытэт — павышэнне якасці прадукцыі, якая выпускаецца, і **паслуг, якія аказваюцца.**

Гэта найважнейшы фактар канкурэнтаздольнасці нашых прадпрыемстваў і краіны ў цэлым. Савет Рэспублікі ўнёс адпаведныя прапановы ва ўрад.

Сітуацыя ў свеце сёння няпростая, у тым ліку з-за эпідэміялагічнай абстаноўкі. Зніжэнне вытворчая актыўнасць, з сур'ёзнымі праблемамі сутыкаюцца сыравінныя і таварныя рынкі, сектар паслуг, парушаны каапераыйныя сувязі паміж дзяржавамі. Негатыўны ўплыў адчуваюць на сабе ўсе краіны свету, у тым ліку і Беларусь. **Гэта патрабуе ад нас мабілізацыі намаганняў,** гатоўнасці апаратыўна рэагаваць на выклікі, якія ўзнікаюць. Мы выдатна разумеем, што галоўнае — гэта эканоміка, а адпаведна, дабрабыт нашых грамадзян. Прадпрыемствы павінны працаваць, людзі — атрымліваць заработную плату, а бюджэт — сродкі для выканання сацыяльных праграм і абавязацельстваў.

Паважаныя калегі!

Асноўны кірунак дзейнасці Савета Рэспублікі — **работа з законапраектамі.** Указам кіраўніка дзяржавы зацверджаны план падрыхтоўкі законапраектаў на бягучы год. Плануецца распрацоўка новых для нашай прававой сістэмы законапраектаў: «Аб валанцёрскай дзейнасці», «Аб самарэгулюемых арганізацыях», «Аб ліцэнзаванні», «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі (спыненні дзейнасці) суб'ектаў гаспадарання», «Аб узносах у бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь».

У ходзе другой сесіі Савета Рэспублікі будзе разгледжана **больш чым 30 законапраектаў.** У іх ліку — праекты законаў «Аб ратыфікацыі Пагаднення паміж Рэспублікай Беларусь і Еўрапейскім саюзам аб спрашчэнні выдачы віз», аб змяненні законаў «Аб гаспадарчых таварыствах», «Аб мерах па прадухіленні легалізацыі даходаў, атрыманых злачынным шляхам, фінансавання тэрарыстычнай дзейнасці і фінансавання распаўсюджвання зброі масавага паражэння», а таксама заканадаўства ў сферы аховы здароўя, натарыяльнай дзейнасці і іншыя.

Законы павінны працаваць эфектыўна, быць зразумелымі грамадству і не мець патрэбы ў частых карэкціроўках. Таму мы выбудоўваем сваю работу такім чынам, каб на пачатковым этапе падключацца да падрыхтоўкі законапраектаў сумесна з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў. Наладжаны адкрыты дыялог з усімі ўдзельнікамі заканатворчага працэсу: дзяржорганамі, грамадскімі аб'яднаннямі, прадстаўнікамі бізнесу, навукі, экспертнай супольнасці.

Выкарыстоўваецца такая форма работы, як разгляд праектаў законаў на выязных пасяджэннях пастаянных камісій у рэгіёнах з прыцягненнем кіраўнікоў мясцовых органаў улады, прадпрыемстваў, а таксама спецыялістаў, якія непасрэдна працуюць на вытворчасці.

У лютым гэтага года на базе саўгаса «Дабраволец» у Клічаўскім раёне адбылося пасяджэнне Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, былі разгледжаны змяненні ў законы ў сферы жывёлагадоўлі і племянной справы. Па выніках падрыхтаваны канкрэтныя прапановы, якія ўлічаны пры дапрацоўцы законапраектаў.

У мэтах выканання даручэння кіраўніка дзяржавы Саветам Рэспублікі апаратыўна выпрацавана больш за 50 сістэмных і комплексных прапаноў па ўдасканаленні заканадаўства аб адміністрацыйнай адказнасці. Большая частка з іх падтрымана зацікаўленымі і ўжо знайшла адлюстраванне ў падрыхтаваных праектах нарматыўных прававых актаў. Мы таксама актыўна ўключыліся ў работу па падрыхтоўцы прапаноў па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у Асноўны закон краіны — Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.

Савет Рэспублікі — орган тэрытарыяльнага прадстаўніцтва, таму важны кірунак для нас — работа **з дэпутацкім корпусам усіх узроўняў.** У міжсесійны перыяд члены Савета Рэспублікі ўзялі ўдзел у пасяджэннях абласных, раённых Саветаў дэпутатаў, выканаўчых камітэтаў, адміністрацый раёнаў. Адбылося першае пасяджэнне абноўленага Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі, на якім выпрацаваны рэкамендацыі мясцовым Саветам дэпутатаў па комплексным і ўстойлівым развіцці падведамасных тэрыторый.

Акрамя таго, праведзены **сустрэчы са старшынямі раённых і гарадскіх Саветаў дэпутатаў** у Віцебскай, Магілёўскай і Гродзенскай абласцях, дзе абмяркоўваліся найбольш актуальныя пытанні іх дзейнасці. У найбліжэйшы час такія сустрэчы будуць арганізаваны ў Брэсцкім, Гомельскім і Мінскім рэгіёнах.

Старшыні Саветаў глыбока ведаюць сітуацыю на месцах, дэталёва знаёмыя з праблемамі. Такі фармат узаемадзеяння дазваляе нам сістэматызаваць інфармацыю з рэгіёнаў, вызначаць тыя кірункі, на якія неабходна звярнуць увагу ў нашай рабоце з законапраектамі. Напрыклад, сельскія Саветы часта застаюцца сам-насам са сваімі праблемамі, што датычацца асвятлення населеных пунктаў, рамонту дарог, землеўпарадкавання, утрымання могілак і інш. Здавалася б — нескладаныя пытанні, але яны жыццёва важныя для людзей у сельскай мясцовасці. І іх трэба вырашаць.

5 снежня 2019 года на сустрэчы з парламентарыямі кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на пытаннях арганізацыі работы са зваротамі грамадзян. Кожны чалавек павінен быць пачуты. За перыяд работы Савета Рэспублікі ў новым складзе да нас паступіла 819 пісьмовых і вусных зваротаў. Гэта амаль удвая больш, чым за ўвесь 2019 год. У асноўным людзі звяртаюцца па пытаннях якасці работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, зямельных і маёмасных адносін, судовых спрэчак. Найбольшая колькасць зваротаў прыпадае на Мінск, Мінскую, Брэсцкую і Магілёўскую вобласці. Асноўная іх частка датычыцца кампетэнцыі мясцовых органаў улады.

Разам з тым, усе звароты, якія паступаюць да нас, разгледжаны, а якія патрабуюць асаблівай увагі, — знаходзяцца ў нас на кантролі. Адказны і добрасумленны падыход да гэтай работы знаходзіць станоўчы водгук у людзей. У Савет Рэспублікі паступілі пісьмы з падзякай Румо Алегу Алегавічу і Ліскоўчу Віктару Андрэевічу за аказанае садзейнічанне ў вырашэнні праблем, з якімі сутыкнуліся людзі.

Важна, што грамадзяне звяртаюцца да нас з прапановамі і ініцыятывамі. Напрыклад, аб стварэнні музейнай экспазіцыі, якая сімвалізуе шлях развіцця Савета Рэспублікі. Цудоўная ідэя, над рэалізацыяй якой мы ўжо працуем.

Хачу звярнуць вашу ўвагу на важны для нас праект. Савет Рэспублікі выйшаў з ініцыятывай аб узаемадзеянні з **Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтрам дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі.** Пры цэнтры будзе створаны папячыцельскі савет, у які ўвойдуць сенатары. Разлічваем, што наша супрацоўніцтва прынясе рэальную карысць дзецям, прыцягне ўвагу грамадскасці да гэтай праблемы. І ўжо сёння Міністэрствам аховы здароўя вядзецца работа па распаўсюджванні гэтага вопыту на ўсе ўстановы сваёй сістэмы.

Найважнейшы кірунак нашай дзейнасці — **работа з моладдзю.** Многае з намечанага намі ўжо рэалізавана. Так, завяршаецца фарміраванне Маладзёжнага савета, які аб'яднае 70 найбольш актыўных прадстаўнікоў моладзі, вылучаных ад абласцей і горада Мінска. У сесійны перыяд нам трэба будзе правесці яго першае пасяджэнне, на якім маладыя парламентарыі зацвердзяць рэгламент сваёй работы, сфарміруюць рабочыя органы. Упэўнена, што Маладзёжны савет стане эфектыўнай камунікацыйнай пляцоўкай, дзе маладыя людзі змогуць узаемадзейнічаць з органамі ўлады, удзельнічаць у заканадаўчай дзейнасці, вырашэнні грамадска-палітычных задач, рэалізоўваць свае ініцыятывы.

Паважаныя калегі!

Міжпарламенцкае супрацоўніцтва з'яўляецца адным з прыярытэтаў нашай дзейнасці. Членамі Савета Рэспублікі актыўна праводзіцца работа **па развіцці міжпарламенцкіх кантактаў і сувязяў** як з краінамі-партнёрамі па інтэграцыйных аб'яднаннях, так і з дзяржавамі блізкага і далёкага замежжа. Створаны 72 рабочыя групы і 4 міжпарламенцкія камісіі, якія дазваляюць ажыццяўляць прамыя кантакты практычна з усімі краінамі свету. 22 групы ўзначальваюць члены Савета Рэспублікі.

Адбыліся сустрэчы з пасламі Расіі, Арменіі, Балгарыі, Вялікабрытаніі і Узбекістана.

Значнымі падзеямі ў міжсесійны перыяд сталі афіцыйныя візіты ў нашу краіну парламенцкай дэлегацыі Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам пад кіраўніцтвам старшыні парламента гэтай краіны Нгуен Тхі Кім Нган, а таксама дэлегацыі Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі на чале са старшынёй Савета Федэрацыі Валянцінай Іванаўнай Мацвіенкай.

З нашымі расійскімі калегамі мы абмяркавалі шырокае кола пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва, а таксама правялі сумеснае пасяджэнне арганізацыйных камітэтаў па падрыхтоўцы **VII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.**

Форум зарэкамендаваў сябе як адна з найбольш рэзультатыўных формаў міжпарламенцкага супрацоўніцтва і эфектыўная пляцоўка для наладжвання і развіцця рэгіянальных сувязяў паміж нашымі краінамі. Восенню яго прыме Мінск і Мінская вобласць. Улічваючы знакавую падзею гэтага года — юбілей Вялікай Перамогі, вызначана галоўная тэма форуму — «Гістарычная спадчына Вялікай Перамогі як аснова развіцця сацыяльна-эканамічных і духоўных сувязяў народаў Беларусі і Расіі».

Сімвалічна, што сёння, у Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі, мы гаворым пра ўзаемадзеянне нашых краін. Дазвольце павіншаваць вас з гэтым святам.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Задач у нас шмат. Галоўнае — каб наша работа была эфектыўнай, садзейнічала ўстойліваму сацыяльна-эканамічнаму развіццю, умацаванню суверэнітэту нашай краіны, павышэнню дабрабыту нашых грамадзян. Толькі разам, адказна і зладжана, у поўнай меры выкарыстоўваючы свае прафесіяналізм і вопыт, мы зможам дабіцца пастаўленых мэт на карысць нашай роднай Беларусі.

Жадаю ўсім вам здароўя, поспехаў і плённай дзейнасці.

Дзякуй за ўвагу.

# ІСЦІ Ў НАГУ З ЧАСАМ І ПРАЦАВАЦЬ НА ПЕРСПЕКТЫВУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На жаль, пандэмія ўносіць свае карэктывы і ў жыццё Беларусі. Зразумела, згушчаць фарбы не варта, але і спрашчаць гэтую праблему таксама нельга. Бо галоўнае для нас — клопат пра здароўе і жыцці нашых грамадзян.

Своечасовае прыняцце дзяржавай выразных прэвентыўных мер дазволіла ўзяць сітуацыю пад кантроль. Вельмі важна, што грамадзяне з разуменнем ставяцца да таго, што адбываецца, захоўваюць спакой і вытрымку. Але самай глыбокай удзячнасці заслугоўваюць нашы ўрачы — за прафесіяналізм, мужнасць і самаадданасць, якія яны праяўляюць, выконваючы сваю высакародную місію. Падтрымаць іх у гэты няпросты час — наш абавязак.

Не менш актуальная задача — мінімізацыя ўплыву эпідэміі на гаспадарчую дзейнасць. Трэба прадумаць формы падтрымкі дзелавой актыўнасці, прасачыць, каб людзі своечасова атрымлівалі зарплаты, пенсіі, каб ім аказваліся неабходныя сацыяльныя паслугі.

Вядома, для падтрымання стабільнасці важная сумесная салідарная работа дзяржавы і грамадства, суб'ектаў гаспадарання і грамадзян, бо адказнасць тут размяркоўваецца на ўсіх практычна ўзроўнях ўплыву.

Больш актыўную пазіцыю ў гэтым пытанні павінны займаць і дэпутаты. Трэба ведаць, што адбываецца на прадпрыемствах і ў арганізацыях акругі, тлумачыць людзям, якія меры прымаюцца для барацьбы з вірусам, чаму так важна праяўляць самадысцыпліну і дакладна выконваць рэкамендацыі медыкаў.

І, праводзячы гэтую работу, нам трэба не выпусціць з-пад увагі іншыя не менш важныя кірункі дзейнасці. Перш за ўсё варта ясна бачыць тыя практычныя задачы, якія трэба сёння вырашаць, каб адстаяць ключавыя сацыяльна-эканамічныя пазіцыі Беларусі.

З гэтага мы павінны зыходзіць пры вызначэнні заканадаўчых прыярытэтаў сесіі. На першы план тут выходзіць стварэнне ўмоў, якія дазваляюць знізіць успрымальнасць нацыянальнай эканомікі да знешніх шокаў. Найважнейшыя з іх — стабільнае дзелавое асяроддзе, павышэнне эфектыўнасці дзяржсектара, развіццё прадпрымальніцтва і нарошчванне экспарту.

Асаблівы акцэнт у сувязі з гэтым хацеў бы зрабіць на фарміраванні праекта рэспубліканскага бюджэту на 2021 год. Нам разам з урадам трэба знайсці вельмі выверменныя рашэнні, якія дазволяць не проста эканомна, але і максімальна эфектыўна расходаваць бюджэтныя сродкі, каб выканаць сацыяльныя абавязацельствы дзяржавы не на шкоду развіццю эканомікі.

Забяспечыць гэты баланс з улікам усіх абставін няпроста. Таму дэпутатам трэба аператыўна падключацца да работы і самым дэталёвым чынам адпрацоўваць літаральна кожны пункт гэтага дакумента.

Акрамя таго, неабходна завяршыць работу над папраўкамі ў законы аб валютным рэгуляванні і валютным кантролі, аб гаспадарчых таварыствах. Важнымі таксама з'яўляюцца прававыя навацыі ў сферах сельскай гаспадаркі, дзяржаўнага рэгулявання гандлю і цэлы шэраг іншых нормаў эканамічнага блока.

Зразумела, моцная, стрэсаўстойлівая эканоміка — гэта аснова. Але практычна раўназначнай для нас з'яўляецца задача развіцця чалавечага патэнцыялу. І ў рамках гэтай сесіі найбольш аб'ёмны пакет змяненняў закране сферы айчыннай аховы здароўя.

Планаваныя навацыі дапамогуць зменшыць чэргі ў паліклініках, аптымізаваць графікі праходжання медаглядаў, забяспечыць бясплатнымі медыкаментамі пацыентаў дзённага стацыянара і зрабіць лекі больш даступнымі для жыхароў вёскі, асабліва тых населеных пунктаў, дзе няма аптэк.

У комплексе ўкараненне гэтых і шэрагу іншых навеўвядзенняў дазволіць не толькі павысіць якасць меддапамогі, адказнасць спецыялістаў і цэлых установ, але і падняць аўтарытэт нашай медыцыны ў грамадстве на тую вышыню, якую яна, безумоўна, заслугоўвае.

Нам таксама трэба фарсіраваць работу над праектам Закона аб правах інвалідаў. Гэта вельмі рэзанансная тэма, бо гаворка ідзе не проста пра безбар'ернае асяроддзе, а пра актыўную сацыяльную інтэграцыю гэтай катэгорыі нашых грамадзян і значнае пашырэнне магчымасцяў іх прафесійнай самарэалізацыі.

Вялікі блок пытанняў датычыцца нацыянальнай бяспекі, аховы правапарадку, павышэння даступнасці і празрыстасці правасуддзя. Упершыню на заканадаўчым узроўні будуць урэгуляваны пытанні абароны персанальных звестак.

Усе гэтыя законапраекты сёння ў цэнтры ўвагі грамадства. Таму трэба дакладна выконваць тэрміны іх падрыхтоўкі, перш за ўсё тых, з якімі пастаянныя камісіі працуюць ужо на працягу года і больш.

Пры гэтым нельга зніжаць увагу да дакументаў, распрацоўка якіх знаходзіцца на пачатковай стадыі. Асаблівае месца тут адводзіцца карэкціроўцы кодэксаў аб адміністрацыйных правапарушэннях. Гэта даручэнне Прэзідэнта.

Людзі ўважліва сочаць, як прасоўваецца наша работа, бо практыка прымянення гэтых законаў — адзін са значных індыкатараў стану канстытуцыйнай законнасці ў краіне. Толькі ў Палату прадстаўнікоў паступіла больш за 600 прапаноў, якія датычацца змены нормаў кодэксаў, што наглядна сведчыць пра запыт грамадства на ўдасканаленне гэтай сферы.

На аснове вывучэння зваротаў грамадзян дэпутатамі ініцыяваны яшчэ адзін важны дакумент. Ён прадугледжвае ўнясенне паправак у Закон аб занятасці насельніцтва і закліка\ны спрыяць зніжэнню беспрацоўя, развіццю дзелавой актыўнасці і выраўноўванню развіцця рэгіёнаў.

Нарэшце, шэраг законапраектаў накіраваны на ўмацаванне міжнароднага супрацоўніцтва. Найбольш актуальная тэма тут для нашых грамадзян — два законапраекты аб ратыфікацыі пагадненняў з Еўрасаюзам аб спрашчэнні візавага рэжыму і рэадмісіі, якія мы плануем разгледзець ужо сёння.

Што да нашай міжнароднай праграмы ў цэлым, яе асноўныя палажэнні і кірункі нашай дзейнасці выпрацаваны. Аднак яе рэалізацыя абцяжараная тым, што краіны сыходзяць на каранцін, адмяняюцца або пераносяцца запланаваныя мерапрыемствы, у тым ліку буйныя міжнародныя форумы.

Назіраючы за працэсамі, якія сёння адбываюцца на планеце, мы разумеем, што свет уступае ў абсалютна новую эпоху. Пандэмія наглядна паказала, чаго вартая сучасная сістэма міжнароднай бяспекі. У свеце пануе разгубленасць, урады дзейнічаюць у адзіночку, а міжнародная супольнасць дэманструе няздольнасць аб'яднаць намаганні.

З улікам выпрацоўкі стратэгіі сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на наступнае пяцігоддзе, мы павінны ўважліва аналізаваць, як усе гэтыя тэндэнцыі могуць адбіцца на будучай архітэктуры светаўладкавання.

Бо сітуацыя і да гэтага была няпростая. Але на сённяшні дзень эканамічны складнік міжнародных адносін яшчэ больш ускладніўся. Па сутнасці, свабоднае перамяшчэнне людзей, тавараў і капіталу амаль спынілася.

Для Беларусі, безумоўна, прынцыповае значэнне мае тое, як у гэтых умовах будуць працякаць інтэграцыйныя працэсы ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза і Саюзнай дзяржавы.

Ва ўмовах глабалізацыі прынцып нацыянальнага эгаізму не працуе. І з пандэміяй, і з сусветным крызісам, і з іншымі выклікамі можна справіцца толькі ў тым выпадку, калі ўсе краіны будуць супрацоўнічаць, паважаючы інтарэсы адна аднай.

У гэтым плане вельмі важна памятаць урокі гісторыі. Цудоўную нагоду для гэтага нам дае юбілей Вялікай Перамогі, які свет будзе адзначаць сёлета.

75 гадоў таму вялікія дзяржавы змаглі пераадолець узаемны недавер і аб'яднацца, каб зберагчы свет ад фашызму. Гэта дазволіла ім не толькі ў даволі кароткія тэрміны справіцца з наступствамі Другой сусветнай вайны, але і пераежыць нябачаны эканамічны ўздым.

Гэты факт як нельга лепш сведчыць пра выгаду адносін, пабудаваных на прынцыпах добрасуседства, раўнапраўя, узаемнага даверу і развіцця эканамічнага супрацоўніцтва.

Пры гэтым вядучыя сусветныя гульцы павінны пачуць не толькі адзін аднаго, але і тыя дзяржавы, якія, не маючы глабальных амбіцый, гатовыя і могуць выступаць як актыўныя суб'екты пабудовы больш справядлівага, бяспечнага і шчаслівага свету.

Паважаныя дэпутаты, на гэтай сесіі Палаце прадстаўнікоў трэба будзе прыняць яшчэ адно важнае палітычнае рашэнне — прызначыць дату выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Цалкам натуральна, што ў такія адказныя для краіны моманты ўзмацняюцца дыскусіі аб шляхах яе развіцця, эфектыўнасці дзейнняў органаў улады па рэалізацыі палітычнага курсу. І тут адна з вядучых роляў павінна належаць парламентарыям.

Дэпутаты павінны быць разам са сваімі выбаршчыкамі і прынцыпова рэагаваць на ўсе пытанні, якія датычацца забеспячэння канстытуцыйных правоў і законных інтарэсаў грамадзян. Сёння гэта перш за ўсё занятасць, дастойная зарплата, жыллё, бяспека, экалогія і надзейныя сацыяльныя гарантыі.

Нароўні з рашэннем чыста практычных пытанняў, з якімі да нас звяртаюцца нашы выбаршчыкі, нам трэба пастаянна падтрымліваць жывую зваротную сувязь з насельніцтвам, працоўнымі калектывамі, мясцовымі органамі ўлады і больш актыўна працаваць у інфармацыйнай прасторы.

У гэтым плане трэба звярнуць асаблівую ўвагу на сацыяльныя сеткі як на адзін з самых запатрабаваных сродкаў зносін. У нас ужо ёсць пазітыўны вопыт у гэтай сферы. Але нам неабходна пашыраць гэтую практыку, каб ісці ў нагу з часам.

Дыялог — гэта важная ўмова ўзаемнага даверу і кансалідацыі, якія ў любых складаных сітуацыях дапамагаюць беларускай дзяржаве і грамадству знаходзіць правільныя рашэнні і паслядоўна рухацца па шляху стварэння моцнай і незалежнай Беларусі.

На заканчэнне, паважаныя калегі, хачу павіншаваць усіх прысутных з Днём яднання народаў Беларусі і Расіі, падзякаваць за добрую падрыхтоўку да сесіі і запрасіць да работы.

---

На слыху

## Павелічэнне колькасці хворых — паступальнае

**У Беларусі рэгіструецца паступальнае павелічэнне колькасці захварэлых на COVID-19, інфармуе Міністэрства аховы здароўя. На цяперашні час 254 чалавекі знаходзяцца на стацыянарным лячэнні з пацверджанай каранавіруснай інфекцыяй, паправіліся і выпісаны 46, зарэгістравана чатыры выпадкі смерці ўзроставых пацыентаў.**

Большасць выпадкаў захворвання — гэта кантакты першага і другога ўзроўняў. У краіне для поўнага выяўлення ўсіх магчымых выпадкаў COVID-19 пачата тэсціраванне ўсіх пацыентаў з сярэднецяжкімі пнеўманіямі — з заборам матэрыялу з ніжніх дыхальных шляхоў, а не толькі выкананнем мазку, што значна павышае дакладнасць наяўнасці інфіцыравання.

— У краіне маюцца як айчынныя, так і імпартныя тэст-сістэмы — у запасе больш за 11 тысяч тэстаў для правядзення лабараторных даследаванняў, працуюць дзевяць лабараторый, яшчэ тры будуць запушчаны пры неабходнасці, — паведаміла **прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія БАРАДУН.** — На сёння пад медыцынскім назіраннем як кантакты першага і другога ўзроўню знаходзіцца 9 тысяч 299 чалавек. З іх адна тысяча 943 чалавекі — у стацыянарных умовах.

У цяперашні час 254 чалавекі знаходзяцца ў стацыянарах краіны на лячэнні з пацверджанай каранавіруснай інфекцыяй. У большасці выпадкаў захворванне працякае ў лёгкай ці сярэдняй форме. 11 пацыентаў маюць патрэбу ў падтрымцы апарата штучнай вентыляцыі лёгкіх, па іх выпадках праведзены медыцынскія кансіліумы з удзелам вядучых інфекцыяністаў і анэстэзіёлагаў-рэаніматолагаў. Стан гэтых хворых ацэньваецца як стабільны. Паправіліся і выпісаны з медыцынскіх устаноў 46 чалавек.

Зарэгістравана чатыры выпадкі смерці ўзроставых пацыентаў з наяўнасцю шматлікіх хранічных захворванняў, якія, паводле папярэдніх звестак, былі ўскладнены каранавіруснай інфекцыяй.

У медыцынскіх установах краіны сфарміраваны неабходны ложкавы фонд. Міністэрства аховы здароўя сумесна з аблвыканкамамі і Мінгарвыканкамам зацвердзілі планы па перапрафіляванні бальніц у залежнасці ад эпідэміялагічнай абстаноўкі, з дакладнай маршрутызацыяй пацыентаў з інфекцыяй COVID-19, а таксама кантактаў першага і другога ўзроўняў.

— Пры перапрафіляванні ложкавага фонду адным з асноўных крытэрыяў з'яўляецца таксама аказанне ў поўным аб'ёме хуткай — неадкладнай і экстраннай — дапамогі пацыентам з іншымі саматычнымі і хірургічнымі захворваннямі, — падкрэсліла Юлія Барадун. — Аб'ёмы аказання такой дапамогі не зніжаны ні ў адным рэгіёне аж да цэнтральных раённых бальніц. Часовае абмежаванне цяпер планавай дапамогі не ўплывае на медыка-дэмаграфічныя паказчыкі. Меры, якія прымаюцца, накіраваны на стрымліванне распаўсюджання інфекцыі за кошт правядзення эпідрасследаванняў і шпіталізацыі ўсіх пацыентаў, нават з бессімптомным носьбітвам і кантактных асоб. Гэта дазваляе стрымліваць лавінападобны рост захваральнасці, характэрны для суседніх краін. Галоўная мэта такой работы — своечасова выявіць усіх, хто, магчыма, інфіцыраваны і можа стаць крыніцай небяспекі для сваіх блізкіх.

**Алена КРАВЕЦ.**

---

## Хуткая эканамічная дапамога

### На падтрымку эканомікі Беларусі будзе накіравана каля ста дзесяці мільёнаў рублёў

**Комплекс мер па падтрымцы эканомікі ўнесены на разгляд кіраўніка дзяржавы. Аб гэтым паведаміў журналістам прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей РУМАС перад адкрыццём другой сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.**

«Урад унёс неардынарны пакет, які прадугледжвае падтрымку цэлых сектараў, у якіх працуюць 550 тысяч чалавек. Таму кіраўнік дзяржавы даслаў гэты комплекс мер для заключэння ў іншыя дзяржорганы. Урад чакае, што нашы калегі з Адміністрацыі Прэзідэнта, Камітэта дзяржкантролю падзяляюць нашы падыходы аб неабходнасці аказання гэтай дзяржпадтрымкі і ў найбліжэйшы час унясуць кіраўніку дзяржавы свае заключэнні», — праінфармаваў кіраўнік урада.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# Спачатку дождж, потым снег, а затым зноў пацяплее...

У першыя дні наступнага тыдня тэмпература паветра складзе плюс 15—20 градусаў

**А пакуль актыўны цыклон, які сфарміраваўся ў Атлантыцы, трымае шлях на ўсход. У сярэдзіне дня яго цэнтр будзе над Карэліяй, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. У другой палове пятніцы яго цыкланічны віхор дасягне і нашай краіны.**

У суботу месцамі пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Вецер прагназуецца заходні, паўночна-заходні парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла, удзень — плюс 5—12 градусаў.

У нядзелю ўначы зноў пахаладае. У асноўным абыдзецца без ападкаў, толькі ўначы па поўначы Беларусі магчымы невялікі кароткачасовы снег. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да мінус 6 градусаў, месцамі — да 8 марозу. Удзень будзе ад плюс 6 градусаў па паўночным усходзе, да 14 цяпла — па паўднёвым захадзе краіны.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня тэмпература паветра з кожным днём будзе павышацца. Ападкаў не чакаецца. У ноч на панядзелак тэмпература ад нуля да мінус 6 градусаў. Удзень чакаецца ўжо 10—16 цяпла, па захадзе краіны — да плюс 18 градусаў. У аўторак вясна пачне браць уладу ў свае рукі. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла, а ўдзень будзе прыпякаць сонца — аж да плюс 20 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Папа Рымскі памаліўся за журналістаў

Па словах Папы Рымскага Францыска, пераражыць працяглую ізаляцыю людзям дапамагаюць у тым ліку сродкі масавай інфармацыі. Супрацоўнікам СМІ, якія застаюцца на рабочым месцы, ён прысвяціў ранішнюю малітву ў сваёй ватыканскай рэзідэнцыі. Як вядома, днямі Папа Рымскі на пустой плошчы Святога Пятра ў Ватыкане выступіў з пасланнем Urbi et Orbi («Гораду і свету»), падчас якога памаліўся аб заканчэнні пандэміі каранавіруса, паведаміла выданне Vatican News. Папа параўнаў тое, што адбываецца ў свеце, з вечарам, калі згушчаецца цемра. «Госпадзе, блаславі свет, дай здароўя нашым целам і супакой нашы сэрцы... Не пакідай нас ва ўладзе буры», — сказаў Папа.

## У Еўропе страцілі рабочыя месцы мільён чалавек




| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 62 | 30 |
| В том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 16 | 3 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | | |
| проценты к получению | 103 | | 4 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 46 | 23 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | 3 | 24 |
| В том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | 3 | 1 |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | | 23 |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 247 | 93 |
| В том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 159 | 93 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | 88 | |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | 197 | 241 |
| В том числе: проценты к уплате | 131 | 1 | 21 |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | 108 | 214 |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | 88 | 6 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 – 110 + 120 – 130) | 140 | 109 | -142 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140) | 150 | -191 | 206 |
| Налог на прибыль (Д99К68) | 160 | 30 | 123 |
| Изменение отложенных налоговых активов (09) | 170 | -6 | -4 |
| Изменение отложенных налоговых обязательств (65) | 180 | | |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) (Д99К68) | 190 | | |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | 2 | 13 |
| Чистая прибыль (убыток) (± 160 – 170 ± 180 ± 190 – 200-205-206) | 210 | -229 | 66 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | | 68 |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | | |
| Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230) | 240 | -229 | 134 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | | |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | | |

Генеральный директор А. А. Белый
Главный бухгалтер О. В. Ладнева
9 марта 2020 г.

По мнению ООО «АудитБизнесКонсалт», годовая бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение Открытого акционерного общества «Дрожжевой комбинат» по состоянию на 31 декабря 2019 года, финансовые результаты ее деятельности и изменение ее финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

# «Першай прачнулася вярба...»



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ:**
**1.** « Зайграйце, ..., // Каб я паскакала». З прыпеўкі. З красавіка — Сусветны дзень вечарынкі. **5.** На Дабравешчанне дзеўка касу не пляце, ... гнязда не ўе (прык.). **9.** Тое, што сніцца; убачыць у ... вярбу — хуткае і маркотнае падарожжа (прыкм.). **10.** Аўтар лірычных літаратурных твораў. **13.** «Бо сягоння Вербніца — ... ў вярбы». З верша Ул. Мазго «Вербніца». Сёлета Вербніца святкуецца 12 красавіка, а Вялікдзень — 19 красавіка. **14.** Чалавек, які валодае пачуццём гумару. **15.** Значнае паляпшэнне ў развіцці чаго-небудзь. **17.** Дзе ..., там і вярба (прык.). **18.** ... парыць — здароўе дарыць (прык.). Сусветны дзень здароўя адзначаецца 7 красавіка. **19.** На Матрону шчупак хвастом ... прабівае (прык.). **21.** Таму цяжка, хто памятае ... (прык.). **22.** Самаробныя галёшы, бахілы. **24.** Беларуская багіня вяснова-летняй урадлівасці. **25.** Шчыпковы музычны інструмент. **30.** Вызваленне ад розных завязак. **32.** Падарожжа. **33.** Дабрата бацькі як гара — высокая, любоў маці як ... — глыбокая (прык.). **34.** Ніз судна. **36.** Гара на Каўказе; такі ж самы пазыўны ў лётчыка-касманаўта, ураджэнца Чэрвеня А. Навіцкага. 12 красавіка — Дзень авіяцыі і касманаўтыкі. **37.** Вялікая Чырвоная ... . Дзень велікоднага тыдня, калі фарбавалі велікодныя яйкі.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ:**
**1.** «Першай прачнулася вярба — // Руплівая ...». З верша М. Танка «Вясной». **2.** «Як сад зацвітаў, // Як ... ўзышла». З беларускай народнай песні «А ў полі вярба нахілёная». **3.** Асадак на дне вадаёмаў. **4.** «Як матулька, вярба // Хіліць ... над ім». З верша Я. Коласа «Ручай». **6.** Падсмажаная лустачка хлеба. **7.** Дарога. **8.** Старадаўні спосаб марскога бою. **11.** Калі з вярбы ляціць — сей позні авёс (прыкм.). **12.** Які дуб, такі і клін, які бацька, такі і ... (прык.). **16.** «... ў лес, здароўе ў косці». Пажаданне, з якім сцябалі адно аднаго галінкамі асвечанай вярбы ў Вербную нядзелю. **17.** Адна з назваў Вялікадня. **20.** Хваравіты стан; каб ачуняць ад ..., раілася з'есці дзевяць пупышак (коцікаў) з асвечанай вярбы. **23.** Мастак, які займаецца пластыкай. **26.** Прэсnаводная рыба. **27.** «Пасярод двара стаяла вярба, // ... красна к нам прыйшла». З вяснянкі. **28.** Закончаная частка спектакля. **29.** Узнагарода пераможцу ў спаборніцтве. **30.** Механізм для замыкання і размыкання электрычнага ланцуга. **31.** Пастка (перан.). **35.** Вялікі майстар сваёй справы (перан.).

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** 1. Музыкі. 5. Птушка. 9. Сон. 10. Лірык. 13. Свята. 14. Гумарыст. 15. Зрух. 17. Вада. 18. Цела. 19. Лёд. 21. Зло. 22. Чуні. 24. Лада. 25. Арфа. 30. Развязка. 32. Турнэ. 33. Акіян. 34. Дно. 36. Казбек. 37. Субота.
**Па вертыкалі:** 1. Маладзіца. 2. Зара. 3. Іл. 4. Голаў. 6. Тост. 7. Шлях. 8. Абардаж. 11. Пух. 12. Сын. 16. Хвароба. 17. Вялічка. 20. Ліхаманка. 23. Пластык. 26. Язь. 27. Вясна. 28. Акт. 29. Прыз. 30. Рэле. 31. Сіло. 35. Ас.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.37 | 19.50 | 13.13 |
| Віцебск — | 6.25 | 19.41 | 13.16 |
| Магілёў — | 6.27 | 19.40 | 13.13 |
| Гомель — | 6.25 | 19.35 | 13.10 |
| Гродна — | 6.52 | 20.05 | 13.13 |
| Брэст — | 6.55 | 20.03 | 13.08 |

### Месяц

*Першая квадра*
*1 красавіка.*
*Месяц у сузор'і Льва.*

### Імяніны

*Пр.* Кірылы, Фамы, Фёдара, Якава.
*К.* Ірэны, Рэнаты, Антона, Панкрата, Рышарда.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 3 КРАСАВІКА

**У краіне**

**1890** год — нарадзіўся Барыс Маркавіч Шпэнцэр, вучоны ў галіне хімічнай тэхналогіі, доктар хімічных навук (1934), прафесар (1932), член-карэспандэнт НАН Беларусі (1936). Удзельнічаў у арганізацыі вытворчасці буры, борнай кіслаты, жоўтага фосфару і іншых хімічна чыстых прэпаратаў, вывучаў эканоміку хімічнай прамысловасці і тэхналогію хімічнай вытворчасці. У 1937 годзе арыштаваны і прыгавораны да выключнай меры пакарання. У 1938-м расстраляны. Рэабілітаваны ў 1956 годзе.

**1925** год — нарадзіўся Аляксей Апанасавіч Філіпенка, поўны кавалер ордэна Славы.

**1937** год — нарадзіўся Іван Іванавіч Антановіч, беларускі філосаф і дзяржаўны дзеяч, доктар філасофскіх навук (1973), прафесар (1977), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1996).



**1987** год — прайшоў першы музычны фестываль «Мінская вясна» (з таго часу праводзіцца штогод).

**У свеце**

**1885** год — нарадзіўся Барыс Андрэевіч Вількіцкі, рускі гідрограф-геадэзіст. У 1913—1915 гадах начальнік гідраграфічных экспедыцый у Паўночны Ледавіты акіян на суднах «Таймыр» і «Вайгач».

**1920** год — нарадзіўся Юрый Маркавіч Нагібін, расійскі пісьменнік. Неаднаразова бываў у Беларусі, пісаў артыкулы пра вызваленне рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Паводле яго аповесці «Старонкі жыцця Трубнікава» пастаўлены фільм «Старшыня», правобраз галоўнага героя — старшыня калгаса «Рассвет» Кіраўскага раёна Кірыл Арлоўскі. Аповесць «На ціхім возеры» прысвечана нарачанскім рыбакам.



**1935** год — нарадзіўся Уладзімір Міхайлавіч Шуралёў, ваенны дзеяч, генерал арміі (1989).

**Так гаварыў...**

**ПЛІНІЙ СТАРЭЙШЫ:**
*«Няма мастацтва больш карыснага, чым медыцына».*

## УСМІХНЕМСЯ

Раніцай — снежань, вечарам — сакавік, і ўсё гэта называецца красавік.

**— Дарагі, а што будзе, калі доўга-доўга, усю ноч, глядзець на Месяц?**
**— Можна не выспацца.**

Акцыя на бензазапраўцы: «Запраўце поўны бак, і пяць літраў мы дальём бясплатна!»

**Сын прыйшоў са школы і радасна паведамляе: «Мам, табе пашанцавала сёння, задалі толькі па чытанні!»**

Галоўныя пытанні чалавецтва: «Хто вінаваты?» і «Што рабіць?».
Галоўныя пытанні сабацтва: «Што ты жуеш?» і «Дзе ты гэта ўзяў?».




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); адздзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.
прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым знач-ком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1276.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 2 красавіка 2020 года.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

3 красавіка 2020 г. № 13 (549)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ТЭМА ТЫДНЯ

# Дэмаграфія: рэаліі часу



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Спачатку — добрая навіна. У Беларусі дасягнуты экстрэмальна нізкія паказчыкі дзіцячай і мацярынскай смяротнасці, павялічылася працягласць жыцця. Але пры гэтым дэмаграфічны прырост насельніцтва скарачаецца, і лічбы па нараджальнасці ў найбліжэйшыя гады застануцца нізкія. Менавіта ад такіх паказчыкаў, а таксама ад шэрагу іншых фактараў (ад узроўню бясплоднасці і даступнасці рэпрадуктыўных тэхналогій да ўзроўню развіцця ўсёй медыцыны) залежыць дэмаграфічная сітуацыя ў краіне.**

стар. 13

СЛУХАЦЬ І ЧУЦЬ

# КРЭАТЫЎНАСЦЬ І ДЫНАМІЗМ — ТОЕ, ШТО ТРЭБА

Што паказала першая прамая тэлефонная лінія Андрэя БУГРОВА ў якасці новага старшыні Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў

## Хто адкажа за брак?

Напярэдадні лініі на інтэрнэт-старонцы Мінгарсавета быў змешчаны аналіз прыёмаў грамадзян дэпутатамі ў 2019 годзе. Згодна з гэтай інфармацыяй большасць (адна траціна) зваротаў мінчан датычылася сістэмы гарадской жыллёва-камунальнай гаспадаркі, потым ішлі пытанні аховы здароўя, жылля, будаўніцтва і рамонту дарог, абсталявання спартыўных і дзіцячых пляцовак, добраўпарадкавання двароў, прыборкі пад'ездаў, стаянак для асабістага транспарту. На апошнім месцы ў гэтым спісе значыўся капітальны рамонт жылых дамоў.



Аднак падчас тэлефоннай лініі праблематыка капрамонтаў, калі ўлічыць працягласць аповедаў і эмацыянальны настрой тых, хто тэлефанаваў, стала, бадай, галоўнай тэмай. Некаторыя званкі выклікалі справядлівае абурэнне ў старшыні Мінгарсавета. Напрыклад, скарга сталага інваліда на тое, што ён з-за разгільдзяйства рамонтнікаў вымушаны ўжо амаль месяц жыць у непрыстасаваным жыллі без гарачай вады. Хоць у іншых кватэрах яна ёсць. Проста работнікі таварыства з абмежаванай адказнасцю «Бытбудрамонт», якія вядуць капрамонт, дапусцілі брак і не хочуць яго выпраўляць. Акрамя гэтага (нібыта здзекуюцца), яны адключылі ўнітаз ад халоднай вады, і чалавек вымушаны набіраць яе ў пластыкавыя бутэлькі. Сітуацыя ўскладняецца тым, што Дзмітрый Андрэвіч жыве ў кватэры адзін і разлічваць можа толькі на сацыяльнага работніка.

Андрэй Бугроў папрасіў прабачэння ў інваліда з-за выкліканых гора-рамонтнікамі нязручнасцяў і паабяцаў, што літаральна ў найбліжэйшы час яго наведаюць прадстаўнікі гарадской жыллёва-камунальнай гаспадаркі і вырашаць пытанне.

стар. 3

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### На парадку дня



Дэпутаты ратыфікавалі візавае пагадненне з Еўрасаюзам. стар. 2

### Бабоўка як варыянт



Досвед Жлобінскага раёна ацанілі кіраўнікі Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню. стар. 3

### Прэстыж сельскіх прафесій



Будучае вёскі залежыць ад кадраў. Дзе іх браць? стар. 14

### Як знайсці кампраміс?



Капрамонт працягвае заставацца «галаўным болем» для жыхароў шматпавярховак. стар. 14

### Ідзём да кліента!



Па такім прынцыпе працуюць дзяржрэгістратары ў Брэсцкай вобласці. стар. 15

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Да Форуму рэгіёнаў

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ правяла рабочую сустрэчу па падрыхтоўцы мерапрыемстваў у рамках VII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.**

Яе ўдзельнікі ўнеслі прапановы па арганізацыі секцыі «Сумесныя праекты як фактар стабільнага эканамічнага развіцця Беларусі і Расіі», абмеркавалі пытанні правядзення беларуска-расійскага дзелавога савета і выстаўкі-продажу.

У сустрэчы ўзялі ўдзел намеснік міністра эканомікі Алена Пермінава і намеснік міністра прамысловасці Дзмітрый Харытончык, прадстаўнікі Беларускай гандлёва-прамысловай палаты, бізнес-супольнасці і іншыя зацікаўленыя асобы.

## Фармалізм недапушчальны

**Адбылася рабочая паездка члена Прэзідыума Савета Рэспублікі, старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктара ЛІСКОВІЧА ў Зэльвенскі раён Гродзенскай вобласці.**

Парламентарый паўдзельнічаў у пасяджэнні Зэльвенскага райвыканкама. Былі абмеркаваныя пытанні бяспекі ў сістэме адукацыі, асабліва адзначаная неабходнасць абсталявання дзіцячых садкоў і школ сістэмамі відэаназірання, важнасць захавання нормаў пажарнай і дарожнай бяспекі, стварэння камфортных і бяспечных умоў навучання.

Падчас рабочай паездкі парламентарый таксама азнаёміўся з работай школ і сацыяльных установ райцэнтра.

У той жа дзень Віктар Лісковіч правёў у райвыканкаме прамую тэлефонную лінію. Пытанні датычыліся арганізацыі сацыяльнай дапамогі сталым людзям: дастаўкі прадуктаў харчавання, лекавых сродкаў, прадметаў быту першай неабходнасці і іншага. Таксама размова зайшла і аб арганізацыі вольнага часу моладзі. На ўсе пастаўленыя пытанні парламентарый даў аргументаваныя адказы.

— У рабоце са зваротамі грамадзян пазіцыя Савета Рэспублікі сёння адназначная: фармалізм недапушчальны. Большасць пытанняў, як паказвае практыка, можна вырашыць на месцах. Мы адкрытыя для таго, каб прымаць, выслухоўваць людзей, і гатовыя зрабіць усё, каб дэталёва разабрацца з кожным зваротам, — адзначыў Віктар Лісковіч. Па яго словах, за выкананнем даручэнняў, якія даюцца ў працэсе работы са зваротамі грамадзян, наладжаны строгі кантроль.

## Выканаць наказы грамадзян

**Днямі адбылося чарговае пасяджэнне сесіі Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў 28-га склікання. У ім узялі ўдзел выбраныя ад сталіцы члены Прэзідыума Савета Рэспублікі Сяргей СІВЕЦ і Таццяна РУНЕЦ, а таксама члены Савета Рэспублікі Андрэй ІВАНЕЦ, Алег РУМО і Віктар ЧАЙЧЫЦ.**

У ходзе пасяджэння дэпутаты зацвердзілі справаздачу аб выкананні бюджэту Мінска за 2019 год і План дзеянняў па навядзенні парадку і добраўпарадкаванні тэрыторыі горада на 2020-ы. Таксама былі ўнесены змены ў Інвестыцыйную праграму і бюджэт Мінска на 2020 год, разгледжаны пытанні «Аб рабоце Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб». Было ўзнята пытанне: аб выкананні ў 2019 годзе мерапрыемстваў, распрацаваных для рэалізацыі наказаў, якія выказалі грамадзяне кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў 28-га склікання ў ходзе перадвыбарнай кампаніі.

## Выбраны фармат кантактаў

**Член Савета Рэспублікі Канстанцін ДРАЗДОЎСКІ правёў прамую тэлефонную лінію. Людзі ў асноўным задавалі пытанні наконт эпідэміялагічнай сітуацыі ў краіне, выкліканай каранавіруснай інфекцыяй.**

Сенатар даў неабходную інфармацыю, запэўніў грамадзян у тым, што сістэма аховы здароўя гатовая ў выпадку неабходнасці прыйсці на дапамогу людзям.

Канстанцін Драздоўскі нагадаў аб грамадзянскай адказнасці ў сітуацыі, якая сёння склалася, і заклікаў выконваць элементарныя санітарна-гігіенічныя меры. Бо толькі сумесная мабілізацыя сістэмы аховы здароўя і грамадства дазволіць справіцца з існуючай сусветнай праблемай.

На думку сенатара, выбраны фармат кантактаў з насельніцтвам будзе працягнуты, бо гэта дазваляе выслухаць вялікую колькасць людзей, даць тлумачэнні і парады, пры неабходнасці ўзяць найбольш важныя пытанні на кантроль і аператыўна іх вырашыць.

НА ПАРАДКУ ДНЯ

# БЫЦЬ РАЗАМ У НЯПРОСТЫ ЧАС

**Учора сваю першую вясновую сесію адкрыў і Савет Рэспублікі сёмага склікання. На парадку былі два законапраекты — аб ратыфікацыі пагадненняў аб спрашчэнні выдачы віз і рэадмісіі асоб, якія знаходзяцца на тэрыторыі абодвух бакоў без дазволу, паміж Беларуссю і Еўрапейскім саюзам.**

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** таксама далажыла аб правядзенні ў красавіку сумеснага пасяджэння дзвюх палат парламента для заслухоўвання штогадовага Паслання Прэзідэнта беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу.

У размове з журналістамі Наталля Качанава яшчэ раз падкрэсліла, што сёння Савет Рэспублікі падключаецца да разгляду законаў у самым пачатку працы з імі ў Палаце прадстаўнікоў. Акрамя таго, падчас выязных пасяджэнняў пастаянных Камісій законапраекты фактычна разглядаюцца з тымі людзьмі, якія будуць іх рэалізоўваць на месцах.

Старшыня верхняй палаты парламента расказала, што Савет Рэспублікі выказаў словы падтрымкі ў час эпідэміі італьянскім калегам. Учора быў атрыманы адказ са словамі ўдзячнасці. «Яны пішуць пра тое, што ў такіх сітуацыях мы, дэпутацкі корпус, парламентарыі ўсіх краін павінны яшчэ шчыльней згуртавацца, каб быць разам у вырашэнні такіх нялростых пытанняў», — канстатавала Наталля Качанава.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# АДКРЫТЫЯ ДЛЯ СУСЕДЗЯЎ

## Дэпутаты ратыфікавалі візавае пагадненне з Еўрасаюзам

**Законапраект аб ратыфікацыі Пагаднення паміж Беларуссю і Еўрапейскім саюзам аб спрашчэнні выдачы віз разгледжаны першым на пасяджэнні сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, якая адкрылася ўчора.**



Фота БелТА.

«Без усялякіх сумненняў, гэта сведчанне таго, што Рэспубліка Беларусь адкрытая для сваіх суседзяў, мы стараемся ўмацоўваць кантакты ва ўсіх сферах — перш за ўсё на ўзроўні міжасабовых зносін сярод самых шырокіх сацыяльных слаёў нашых грамадзян», — паведаміў журналістам **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Андрэй САВІНЫХ.**

Пагадненне прадугледжвае абавязацельствы бакоў забяспечыць магчымасць афармлення віз для транзіту ці ўезду для запланаванага знаходжання на працягу не больш чым 90 дзён у любы 180-дзённы перыяд, выдачу шматразовых віз з тэрмінам дзеяння ад аднаго да пяці гадоў для шэрагу катэгорый грамадзян, паніжэнне збору за разгляд хадайніцтва аб выдачы віз да 35 еўра, вызваленне шэрагу катэгорый грамадзян ад аплаты збораў за разгляд хадайніцтваў. Скарочаны і спіс дакументаў, дастатковых для пацвярджэння мэты паездкі.

Адпаведна пратаколу да пагаднення, узгодненыя меры будуць прыняты для спрашчэння транзіту і кароткачасовага знаходжання ўладальнікаў шэнгенскіх віз і дазволаў на пражыванне на тэрыторыі Балгарыі, Харватыі, Кіпра і Румыніі.

Палажэнні пагаднення не прымяняюцца да працэдур выдачы віз Даніі, Вялікабрытаніі і Ірландыі. Дадаткова бакі пажадалі, каб улады Беларусі і Даніі, Вялікабрытаніі, Ірландыі, Швейцарыі, Ісландыі, Ліхтэнштэйна, Нарвегіі неадкладна заключылі двухбаковыя пагадненні аб спрашчэнні выдачы віз.

**Варвара МАРОЗАВА.**

НА СУВЯЗІ

# І пытанні, і падзякі

**Больш за дваццаць пытанняў паступіла на суботнюю прамую лінію, якую правяла намеснік старшыні Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Ірына РАІНЧЫК.**

Амаль палову заяўнікаў турбавалі праблемы ў галіне ЖКГ, іншыя пытанні датычыліся сферы аховы здароўя, гандлю і спажывецкага рынку, працы і занятасці насельніцтва, архітэктуры, будаўніцтва, землеўпарадкавання, культуры, спорту і турызму. Вялікую актыўнасць праявілі магіляўчане, па некалькі тэлефонных званкоў прагучала з Бабруйска, Глуска і Асіповіч, па адным — з Быхава, Горак, Кіраўска, Клічава, Крычава і Мсціслаўскага раёна.

Магіляўчанка, напрыклад, выказала незадаволенасць тым, што непадалёк ад яе знаходзіцца бар з кругласутачным рэжымам работы. Каля дома, у тым ліку і на дзіцячай пляцоўцы, пастаянна збіраюцца шумныя кампаніі, якія парушаюць грамадскі парадак. Яна спадзяецца, што мясцовыя ўлады прымуць меры.

Жыхарка Быхава паведаміла, што ў доме, дзе яна жыве, працякае дах. Яна ўжо звярталася з гэтым пытаннем у райвыканкам, але праблему пакуль не атрымалася вырашыць.

— Некалькі чалавек, якія патэлефанавалі да нас, — з ліку пастаянных, яны перыядычна з розных нагод звяртаюцца ў выканаўчыя органы, — паведаміла Ірына Раінчык. — У цэлым пытанні, што прагучалі гэтым разам, узятыя на кантроль і накіраваны для аператыўнага вырашэння. Вельмі прыемна было пачуць падзяку на адрас дэпутатаў Крычаўскага райсавета і непасрэдна яго старшыні Ірыны Прудніковай за тое, што яны бяруць актыўны ўдзел у навядзенні парадку на зямлі.

Усяго гэтым разам на суботнія прамыя лініі ў абл-, гар- і райвыканкамы паступіла 84 звароты.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# Каб было чыста

## Вясновыя клопаты сельсаветаў

**Пытанні добраўпарадкавання гарадскіх і вясковых тэрыторый абмеркавалі на сумесным пасяджэнні прэзідыума Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў і аблвыканкама.**

Дэпутаты ў сваіх выступленнях падкрэслівалі, што трэба наводзіць і падтрымліваць парадак паўсюдна: у гарадах і на прыгарадных тэрыторыях, у пасёлках і вёсках, не ўпускаць з поля зроку фермы і комплексы, машынна-трактарныя двары, іншыя сельскагаспадарчыя аб'екты.

**Старшыня аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ,** у прыватнасці, нагадаў пра неабходнасць актывізаваць барацьбу з баршчэўнікам. Летась з бюджэтаў рознага ўзроўню на яго знішчэнне было накіравана больш за 660 тысяч рублёў.

**Старшыня Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Віктар ГАЛАНАЎ** звярнуў увагу на ачыстку вясковых тэрыторый ад закінутых і прыйшоўшых у поўны заняпад будынкаў. Паводле яго слоў, апошнім часам знеслі больш за 600 хацін-развалін (план выкананы на 130 %). Але наперадзе шмат работы ў гэтым кірунку — у вобласці застаецца яшчэ каля 1,7 тысячы такіх нікому не патрэбных пабудоў.

Для падтрымкі чысціні ў сельскіх населеных пунктах ужо зроблена каля 430 кантэйнерных пляцовак. Там ўладкавана больш за 800 кантэйнераў для збору адходаў. Здолелі рэкультываваць 95 сельскіх міні-палігонаў цвёрдых камунальных адходаў.

Як падкрэсліў **старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ,** добраўпарадкаванне тэрыторый — важная агульная справа сельсаветаў і райвыканкамаў. Разам яны могуць зрабіць шмат карыснага. Не без удзелу дэпутатаў, напрыклад, летась пасадзілі каля 97 тысяч дрэў і 25 тысяч кустоў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# КРЭАТЫЎНАСЦЬ І ДЫНАМІЗМ — ТОЕ, ШТО ТРЭБА

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Мінчанка Таццяна — таксама ахвяра няякаснага капрамонту: ужо год як кватэру адключылі ад газазабеспячэння. Рамонтнікі абяцалі ўзамен усталяваць электраплiту, называлі крайні тэрмін — верасень 2019 года. Гаспадыня дагэтуль чакае. Ежу гатуе, як яна выразілася, на электраприборах, таму даводзіцца шмат плаціць за электрычнасць. Вось і просіць дапамагчы звaрухнуць справу з месца.

Цікавую ідэю прапанаваў мінчанін, які пільна сочыць за ходам планавай замены ліфтаў у яго пад'ездзе і пад'ездах суседніх дамоў. У адных з іх яе зрабілі якасна, а ў многіх іншых, на жаль, абы-як. Адсюль і прапанова: стварыць гарадскую камісію і праверыць якасць замены ліфтаў за пэўны перыяд. За няякасную работу штрафаваць бракаробаў, прымусіць іх за свой кошт выпраўляць недахопы.

## «Хацелася б бачыць часцей»

Сярод тых, хто тэлефанаваў, былі і заяўнікі, добра знаёмыя прадстаўнікам гарадскіх службаў — апошнія прысутнічалі на прамой лініі разам са старшынёй Мінгарсавета. Гэтых кантакцёраў у пэўным сэнсе можна назваць санітарамі горада. Яны заўважаюць нават дробныя непарадкі, бяруць іх «на аловак», нярэдка фатаграфуюць і адразу сігналізуюць па розныя прамыя і гарачыя лініі ў гарадскія і рэспубліканскія інстанцыі. І з кожным Андрэй Бугроў размаўляў уважліва, унікаў у сутнасць справы.

Людзі інфармавалі старшыню і пра недастатковую тэмпературу гарачай вады, і пра недахопы ў вывазе смецця і бытавых адходаў на перапрацоўчы завод, і пра несправядлівa высокую арэндную плату за жыллё для работнікаў культуры, і пра неабходнасць пашырыць ільготы для шматдзетных сем'яў і г. д.

Быў званок мінчаніна, незадаволенага работай гарадскіх дэпутатаў: маўляў, іх не відаць у акрузе. А таму ён павінен сам сачыць за парадкам на тэрыторыі, у прыватнасці, за станам пешаходных дарожак, графікам руху аўтобусаў і ў выпадку неабходнасці паведамляць куды трэба. А дзе дэпутаты? Іх дзейнасць трэба актывізаваць.

З апошняй высновай старшыня пагадзіўся. Разам з тым звярнуў увагу свайго суразмоўцы на асаблівасці работы ў Мінску гарадскіх дэпутатаў. Іх на два мільёны жыхароў усяго 57. Яны ў гарсавеце працуюць на грамадскіх пачатках. І дэпутаты фізічна не могуць абысці ўсе двары, пад'езды, агледзець дахі дамоў на сваёй тэрыторыі. У іх яшчэ шмат важнай і адказнай работы ў камісіях гарадскога Савета. Тым не менш дэпутатам варта ўдасканаліць працэс узаемадзеяння з электаратам, палепшыць і практыку справаздач перад выбаршчыкамі, каб тыя былі ў курсе спраў сваіх абраннікаў, лічыць Андрэй Бугроў.

> «Ужо год як кватэру адключылі ад газазабеспячэння. Рамонтнікі абяцалі ўзамен усталяваць электраплiту, называлі крайні тэрмін — верасень 2019 года. Гаспадыня дагэтуль чакае».

Трэба адзначыць імкненне новага старшыні ажывіць дзейнасць гарсавета, надаць дэпутацкаму корпусу сталіцы адпаведны рэаліям нашага часу імпульс і дынамізм у рабоце, унесці крэатыўнасць, узмацніць сувязі з выбаршчыкамі, зрабіць іх і больш трывалымі. Скажам, можна праводзіць апытанні сярод мінчан для ацэнкі дзейнасці канкрэтнага дэпутата. На інтэрнэт-старонцы Мінгарсавета плануецца размяшчаць водгукі, каментарыі і лісты.

Увогуле Андрэй Бугроў заклікае дэпутатаў больш актыўна выкарыстоўваць у сваёй рабоце сучасныя метады камунікацыі, выбудоўваць сувязі з выбаршчыкамі праз сацыяльныя сеткі і іншыя платформы — карацей, зрабіць работу дэпутатаў сучаснай і эфектыўнай. А што час наспеў, пацвердзіў згаданы званок незадаволенага мінчаніна.

У размове з карэспандэнтам «МС» Андрэй Бугроў адзначыў, што сярод рэзерваў гарадскіх улад ён бачыць больш актыўнае прыцягненне неабыякавых мінчан да працэсу самакіравання — дзеля вырашэння злабадзённых пытанняў як горада, так і па месцы жыхарства. Задзейнічаць інструментарый самакіравання па поўнай праграме, як той казаў.

А праблем у Мінску хапае. Напрыклад, сёлета плануецца рост колькасці капрамонтаў. Чаму б сумеснымі намаганнямі грамадзян і дэпутатаў не ўзяць пад кантроль ход капітальных рамонтаў дамоў — прасачыць, як ажыццяўляецца ў сталіцы эксперымент па рамонце жылля цэлымі кварталамі, абдумаць іншыя падыходы, якія дазволяць скараціць тэрміны работ, знізіць выдаткі, лепш добраўпарадкаваць двары?

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

ДЭПУТАТЫ, НА ВЫЕЗД!

# Бабоўка як варыянт вёскі будучыні

**Эканомія бюджэтных сродкаў, якую дае продаж старых кінутых дамоў, мадэрнізацыя вулічнага асвятлення ў вёсках, іншы досвед Жлобінскага раёна па развіцці і добраўпарадкаванні населеных пунктаў ацанілі падчас выязнога семінара кіраўнікі Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню Гомельскай вобласці.**

Прадстаўнікі мясцовых улад рэгіёна на чале з кіраўніком абласнога Савета дэпутатаў Кацярынай Зенкевіч сабраліся ў аграгарадку Бабоўка Кіраўскага сельсавета. У цэнтры населенага пункта — нядаўна адрамантаваны будынак Дома культуры. Побач пошта, дзіцячы садок, школа. Але позіркі гасцей прыцягвае мініпарк — новы сацыяльна значны аб'ект. Брукаваныя дарожкі, альтанка, дзіцячая пляцоўка, лавы — усё ў адпаведнасці з ланшафтным праектам. Побач закладзены сямейны сквер.

— Пра стварэнне гэтай зоны адпачынку думалі даўно. Цяпер тут любімае месца нашых жыхароў, — кажа **дырэктар ААТ «Бабоўскі» Алі АХМЕДАЎ.**



**Падчас выязнога семінара.**

Жыхары аграгарадка на жыццё не скардзяцца: сярэдняя зарплата на прадпрыемстве каля 800 рублёў. Акрамя гэтага, выдаткоўваюцца прадукты харчавання, але пры ўмове, што работнік не парушае працоўную дысцыпліну. Не забываюць і пенсіянераў, якіх у Бабоўцы 225. Кожнаму на падворак бясплатна прывозяць угнаенні, сена, салому для жывёлы. Да свят заўсёды робіць падарункі. Калі спатрэбіцца, дапамогуць і агароджу паставіць, і газавы кацёл адрамантаваць.

«Бабоўскі» падтрымлівае таксама мясцовую школу і дзіцячы садок. Сярод школьнікаў вядзецца прафарыентацыя, іх прапаноўваюць мэтавае накіраванне для паступлення ў сельскагаспадарчыя ВНУ і каледжы, стыпендыю на час вучобы. Дарэчы, выдатнікі мясцовай школы таксама атрымліваюць стыпендыю ад гаспадаркі. А 12 маладых спецыялістаў, якія цяпер працягваюць адукацыю, маюць прыбаўку да заработнай платы. За сродкі гаспадаркі для дзіцячага садка адрамантавалі агароднінасховішча, зрабілі водапаніжэнне тэрыторыі, навесы для летняга адпачынку малых.

— Дарэчы, аграгарадок Бабоўка разглядаюць як прыклад «вёскі будучыні», — з гонарам дадае **старшыня Кіраўскага сельвыканкама Канстанцін СЦЕПАНЦОЎ.** — Тут усё робіцца для камфортнага жыцця людзей. Нядаўна мы правялі маштабную работу па добраўпарадкаванні тэрыторыі. Дапамагалі дарожныя і камунальныя службы раёна, мясцовыя жыхары працавалі на суботніках.

З тым, як вырашаюцца праблемы па добраўпарадкаванні тэрыторыі ў іншых сельскіх населеных пунктах, удзельнікі семінара пазнаёміліся, у прыватнасці, на прыкладзе Майскага сельсавета.

— Тут ёсць праблемы з пакінутымі домаўладаннямі. Але ж да кожнай сітуацыі — індывідуальны падыход. Вось прыклад. Дом на цэнтральнай вуліцы, пакуль гаспадар адбываў пакаранне, прыйшоў у заняпад. Звязваліся з гаспадаром, прапанавалі, каб вызначыўся: пакіне за сабой сядзібу ці дае згоду на знос. Ён катэгарычна адмовіўся ад апошняй прапановы. Вырашылі пачакаць. Не так даўно чалавек вярнуўся з месца пазбаўлення волі, уладкаваўся механізатарам і рыхтуецца да рамонту дома, — кажа **старшыня сельскага Савета Аляксандр ІСАЕНКА.**

Калі старыя хаты зусім абваліліся, а гаспадары не знаходзяцца і не адгукаюцца, прымаецца рашэнне аб зносе будынка, а зямля перадаецца ў сельгасабарот. Некаторыя кінутыя дамы выстаўляюцца на продаж праз аўкцыён. Атрымалася зарабіць такім чынам чатыры тысячы рублёў — гэта істотны фінансавы дадатак.

Аляксандр Ісаенка расказаў і аб вырашэнні праблемы збору смецця ў вёсках. Там усталявалі стацыянарныя кантэйнеры, зрабілі пляцоўкі для іх размяшчэння ў адпаведнасці з неабходнымі санітарнымі нормамі. Вываз смецця адбываецца раз на тыдзень. У невялікіх вёсках наладжаны паасобны вываз смецця ад дамоў гаспадароў. Людзі могуць звярнуцца і з заяўкай на бязвыплатны вываз буйнагабарытнага смецця спецтэхнікай. Яшчэ Майскі сельвыканкам актыўна вырашае праблемы вулічнага асвятлення. Значную эканомію дае ўкараненне энергазберагальных святлодыёдных лямпаў.

— Вельмі цікавы вопыт вырашэння праблем энергазабеспячэння на вуліцах у сельскай мясцовасці, — падвяла вынікі сустрэчы **старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ.** Яна звярнула ўвагу ўдзельнікаў семінара на практыку работы сельвыканкамаў раёна з новымі сістэмамі дыстанцыйнага зняцця паказчыкаў. Карысным можа стаць і прыклад пераасначшэння асвятляльнага абсталявання. Але важна пралічыць рэнтабельнасць, якая адаб'ецца ў тым ліку і на рабоце сельвыканкамаў.

Кацярына Зенкевіч падкрэсліла, што ў кожным раёне свой стыль работы і сістэма ўзаемадзеяння паміж органамі ўлады, арганізацыямі, прадпрыемствамі, аднак падобныя семінары — магчымасць адзначыць тое, што будзе карысна і запатрабавана для сваёй тэрыторыі. Важна, каб дэпутаты самі выступалі з ініцыятывамі і заахвочвалі жыхароў сельскай мясцовасці таксама актыўна ўключацца ў работу па развіцці і добраўпарадкаванні родных мясцін.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**

БУДЗЕМ ЗДАРОВЫЯ

# ПАЛЕПШЫЦЬ ДАСТУПНАСЦЬ І НЕ СТРАЦІЦЬ ЯКАСЦІ

**У Мінскай вобласці ствараюцца чатыры тэрытарыяльныя цэнтры спецыялізаванай медыцынскай дапамогі**

**Іх адкрыюць у Барысаве, Салігорску, Маладзечне і Мінскім раёне. Летась у рэгіёне ўжо ўвялі ў эксплуатацыю дзясяткі медыцынскіх аб'ектаў. Сёлета працягваецца будаўніцтва новых і пераабсталяванне існуючых медустаноў. Таксама плануецца ўдасканальваць медыцынскую дапамогу ў Рудзенску, Смалявічах і Фаніпалі.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## КАНЦЭПЦЫЯ Ў ДЗЕЯННІ

— У 2018 годзе ў вобласці была распрацавана канцэпцыя развіцця чатырох тэрытарыяльных цэнтраў спецыялізаванай медыцынскай дапамогі. Канцэпцыю падтрымала Міністэрства аховы здароўя, у тым ліку і з пастаўкамі высокатэхналагічнага абсталявання за кошт рэспубліканскага бюджэту, — расказвае **начальнік галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Мінскага аблвыканкама Наталля БАЯРСКАЯ.** — Такія цэнтры ствараюцца для паляпшэння даступнасці і якасці лячэння незалежна ад месца пражывання, канцэнтрацыі і эфектыўнага выкарыстання медыцынскіх кадраў і абсталявання. Яны сфарміраваны з улікам транспартнай даступнасці для замацаваных раёнаў: у Барысаве, Мінскім раёне, Маладзечне і Салігорску. Апорныя бальніцы — у Жодзіне і Слуцку.

Новае абсталяванне для МРТ, якое ўжо выкарыстоўваецца ў Барысаве і Маладзечне, дазволіла палепшыць даступнасць абследавання планавых пацыентаў і скараціць тэрмін чакання да 10-14 дзён. На завяршаючым этапе цяпер знаходзіцца ўстаноўка апарата і ў Салігорскай бальніцы. Амаль гатовы да ўводу ў эксплуатацыю ангіяграфічныя комплексы ў Барысаўскай і Маладзечанскай ЦРБ.

Пры гэтым зношанасць матэрыяльна-тэхнічнай базы медустаноў і недахоп кадраў найбольш актуальныя для Мінскага і Барысаўскага раёнаў. Таму менавіта там і будзе прымацца шэраг мер.

У Барысаве ўзводзяцца дзіцячы шматпрофільны корпус на 116 ложкаў, станцыя пералівання крыві, таксама рэканструюецца хірургічны корпус.

Асаблівую заклапочанасць ва ўлад вобласці выклікае Мінскі раён. Паводле слоў Наталлі Баярскай, штогадовы прырост насельніцтва тут складае каля 10 тысяч чалавек. Недахоп інфраструктуры, высокая цякучасць медыцынскіх кадраў (блізка Мінск, побач шмат медыцынскіх устаноў рэспубліканскага значэння) таксама ўскладняюць сітуацыю. Фактычная нагрузка амбулаторна-паліклінічных падраздзяленняў вышэйшая за планавую ў тры разы. Адсюль незадаволенасць насельніцтва чэргамі. Таму развіццё сістэмы аховы здароўя ў прысталічным раёне ўяўляецца важнай справай.

У раёне запланавана будаўніцтва васьмі аб'ектаў, а два ўжо ўведзены ў эксплуатацыю. Гэта тэрапеўтычны корпус на 180 ложкаў і Хацежынская лячэбная амбулаторыя. Распрацоўваецца праектна-каштарысная дакументацыя на будаўніцтва Азярцоўскай паліклінікі на 200 наведванняў у змену і паліклінікі ў Бараўлянах на 800 наведванняў у змену. Іх будаўніцтва мяркуецца пачаць у другой палове бягучага года. Таксама вядзецца праектаванне медыцынскага комплексу ў Заслаўі. Гэта бальніца на 300 ложкаў і паліклініка на 700 наведванняў у змену. Запланавана будаўніцтва паліклінікі ў Копішчы на 1330 наведванняў і амбулаторыі ў Прылуках на 200 наведванняў.

## АМАЛЬ 12 МІЛЬЁНАЎ НА МЕДТЭХНІКУ

Новым абсталяваннем забяспечваюцца не толькі тэрытарыяльныя цэнтры і апорныя бальніцы, але і бальніцы першага тэхналагічнага ўзроўню.

— Мы прааналізавалі стан матэрыяльна-тэхнічнай базы, сканцэнтравалі фінансавыя сродкі ў абласным бюджэце і цэнтралізавалі заяўкі на закупку абсталявання. І штогод вырашаем праблемы па некалькіх кірунках. У прыватнасці, у 2018 годзе закупілі ўльтрагукавую і дыхальную апаратуру, у 2019 набылі 53 адзінкі эндаскапічнага абсталявання. У выніку сёння любая медустанова першага ўзроўню валодае асноўным спектрам дыягнастычных працэдур. З улікам маючай адбыцца рэарганізацыі хірургічнай службы ў 2020 годзе плануецца закупіць 13 адзінак відэалапараскапічнага абсталявання.

Акрамя таго, для пераасна-шчэння ўстаноў аховы здароўя летась набыта ліфтавага абсталявання на суму 4,6 мільёна рублёў. На інфарматызацыю выдаткавана 1,25 мільёна рублёў, на пажарную бяспеку — 2,48 мільёна. Усяго на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы медустаноў, у тым ліку на будаўніцтва і рэканструкцыю, з бюджэту Мінскай вобласці было накіравана 53,3 мільёна рублёў. З іх на медыцынскае абсталяванне — 11,8 мільёна.

Апраўдала сябе і практыка перасоўных медыцынскіх комплексаў для жыхароў маланаселеных і аддаленых вёсак. Для паляпшэння даступнасці медыцынскай дапамогі сёння яны дзейнічаюць у сямі раёнах Мінскай вобласці. Адпрацаваны маршруты іх руху і кратнасць выездаў. У выніку палепшылася даступнасць дыягнастычнай дапамогі, лекавага забеспячэння, зменшэнне колькасці выклікаў хуткай медыцынскай дапамогі. Такія комплексы даюць магчымасць ажыццяўляць прафілактычныя медыцынскія агляды работнікаў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў без адрыву ад вытворчасці. У 2020 годзе запланавана набыць іх яшчэ пяць. Акрамя гэтага, плануецца закупіць 162 аўтамабілі — гэта дазволіць абнавіць парк на траціну.

## НОВАЯ ТЭХНАЛОГІЯ ХАТНЯЙ КАРДЫЯТАКАГРАФІІ

У рамках праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва «Польшча — Беларусь — Украіна 2014—2020» у Мінскай вобласці пачата рэалізацыя двух сумесных праектаў. Адзін з іх прадугледжвае аснашчэнне гібрыдным ангіяграфічным комплексам абласной клінічнай бальніцы. Другі — арганізацыю дыстанцыйнага фертыльнага маніторынгу для цяжарных жанчын у абласным клінічным радзільным доме. Гэта дазволіць на адлегласці ацэньваць стан плода. Тэхналогія так званай хатняй кардыятакаграфіі будзе ўкаранёна ў вобласці ўпершыню ў краіне.

Пэўныя захады робяцца і для прыцягнення перспектыўных медыцынскіх кадраў. У прыватнасці, гэта забеспячэнне дастойнай заработнай платай і жыллём.

Сёння ўзровень сярэдняй заработнай платы медработнікаў у Мінскай вобласці — найвышэйшы ў краіне. Для іх будуецца жыллё. Летась здадзены інтэрнат для супрацоўнікаў дзіцячай абласной клінічнай бальніцы, у Астрашыцкім Гарадку праведзена рэканструкцыя санаторыя «Кааператар» у інтэрнат для медыцынскіх работнікаў, уведзены ў эксплуатацыю інтэрнат маласямейнага тыпу ў вёсцы Ляскоўка. Патрабуецца будаўніцтва інтэрнатаў у Барысаве, Салігорску і Маладзечне. Гэта павысіць замацаванасць маладых спецыялістаў на першых рабочых месцах.

У 2020 годзе працягнецца стварэнне тэрытарыяльных цэнтраў, будаўніцтва аб'ектаў у Мінскім і Барысаўскім раёне, дзіцячай паліклінікі ў Жодзіне, пачата праектаванне хірургічнага корпуса Мінскай абласной клінічнай бальніцы. Акрамя таго, 20 мільёнаў рублёў накіраваны сёлета на набыццё высокатэхналагічнага медыцынскага абсталявання для пераснашчэння оталарынгалагічнай і афтальмалагічнай службаў цэнтраў спецыялізаванай медыцынскай дапамогі. Яшчэ адным прыярытэтным кірункам стане развіццё сістэмы аховы здароўя ў такіх гарадах, як Рудзенск, Смалявічы і Фаніпаль.

**Алена КРАВЕЦ.**

ДАВЕДКА

**У Мінскай вобласці сёння працуюць 793 арганізацыі аховы здароўя. Сярод іх — 22 цэнтральныя раённыя бальніцы, Жодзінская гарадская бальніца, восем абласных устаноў аховы здароўя, 39 участковых бальніц, 150 урачэбных амбулаторый, 373 фельдчарска-акушэрскія пункты, 18 бальніц сястрынскага догляду. Служба хуткай дапамогі прадстаўлена 24 станцыямі хуткай дапамогі. Акрамя таго, у рэгіёне працуюць 622 амбулаторна-паліклінічныя установы і тры станцыі пералівання крыві.**

КОМПЛЕКСНЫ ПАДЫХОД

# БЕЗ ДРОБЯЗЯЎ

**Некаторыя асаблівасці ўдасканалення работы мясцовых органаў улады ў сферы дэмаграфіі**

**У Віцебскай вобласці ганарацца, што першым чалавекам, які нарадзіўся сёлета ў Беларусі, стала дзяўчынка з абласнога цэнтра. Яе маці літаральна пад бой курантаў зрабіла свой унёсак у паляпшэнне дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне.**

На Віцебшчыне пытанні дэмаграфіі знаходзяцца ў цэнтры ўвагі мясцовай улады. Летась на поўначы краіны былі выкананы асноўныя паказчыкі дзяржаўнай праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь». Забяспечваюцца ўсе сацыяльныя стандарты. А чаканая сярэдняя працягласць жыцця насельніцтва ў параўнанні з 2010 годам павялічылася на 4,3 года і склала 73,8 года.

Гэта, безумоўна, вынік комплексных мер, якія прымае мясцовая ўлада. У вобласці апошнім часам не зарэгістравана выпадкаў мацярынскай смяротнасці. Колькасць у структуры смяротнасці жыхароў, якія памерлі ў працаздольным узросце, працягвае заставацца самай нізкай у краіне. Летась было адкрыта аддзяленне суправаджальнага пражывання ў аграгарадку Бычыха Гарадоцкага раёна, працягваліся рэканструкцыя полацкага дома-інтэрната, капітальныя і бягучыя рамонты трох дамоў-інтэрнатаў у Аршанскім раёне. Дарэчы, у вобласці сёння функцыянуюць 25 тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і 15 дамоў-інтэрнатаў для састарэлых і інвалідаў.

У 2019 годзе былі здадзены «пад ключ» цэнтральная паліклініка ў мікрараёне Поўдзень-7 Віцебска, алергацэнтр у Наваполацку, чатыры амбулаторыі ўрача агульнай практыкі і г. д. Сталі прымаць пацыентаў стаматалагічныя аддзяленні ў Браславе, Докшыцах, Верхнядзвінску.

Агульнавядома, што здароўе, даўгалецце залежаць ад якасці пітной вады. Летась у вобласці пабудавана каля 60 аб'ектаў водазабеспячэння і каналізацыі, каля 75 % з іх — уласнымі сіламі аблвадаканала. Выкананне работ гаспадарчым спосабам, дарэчы, забяспечвае эканомію бюджэтных сродкаў на 30 %. Напрыклад, толькі на адным аб'екце ў Аршанскім раёне сэканомілі 1 мільён рублёў. Актыўна ўводзяцца ў эксплуатацыю станцыі абезжалезвання.

Выкананне задач дэмаграфічнай бяспекі ў цэнтры ўвагі не толькі мясцовай улады розных узроўняў, але і праваахоўных органаў. На жаль, не ва ўсіх раёнах вобласці належным чынам выконваюцца падпраграмы № 1 «Сям'я і дзяцінства» і № 3 «Прадухіленне і пераадоленне п'янства і алкагалізму». Актуальнымі застаюцца пытанні абароны правоў дзяцей, якія пацярпелі ад жорсткасці і гвалту ў асобных сем'ях.

У дэмаграфічнай тэме дробязяў не бывае. І напрацаваны гадамі досвед, комплексны падыход да вырашэння наспелых праблем ужо даюць станоўчыя вынікі: павялічваецца колькасць насельніцтва, зніжаецца смяротнасць сярод працаздольных грамадзян, падлеткаў і дзяцей.

***Аляксандр ПУКШАНСКІ.***

Тэлесеткі

# Сакрэтны фактар поспеху і папулярнасці

**Напрыканцы мінулага тыдня чарговы рэгіянальны падкастынг прайшоў у Гомелі. І трэці горад у маршруце папулярнага шоу X-Factor адзначыўся рэкордпай колькасцю ўдзельнікаў праслухоўвання. На сцэну Гомельскага абласнога грамадска-культурнага цэнтра за два дні выйшлі 250 кандыдатаў.**

З мэтай прафілактыкі каманда праекта сустракала ўдзельнікаў з тэрмометрам і прапаноўвала апрацаваць рукі антысептыкам. Дэзынфіцыравалі таксама і мікрафоны. А саміх выканаўцаў максімальна разводзілі па часе, каб не збіралася шмат людзей разам. Так, тыя, хто праходзіў рэгістрацыю анлайн на сайце Белтэлерадыёкампаніі, напярэдадні атрымлівалі СМС-паведамленне з указаннем часу прыходу на праслухоўванне. Паспрабаваць сябе на вялікай сцэне гэтым разам прыйшлі людзі розных прафесій, узростаў і статусаў. Спявалі ўсе выключна па рэгламенце і a capella. Дарэчы, некаторыя, як самі прызнаваліся, удзельнічалі ў перадкастынгу не ўпершыню, абгрунтоўваючы такі ход жаданнем запомніцца журы сярод іншых кандыдатаў. А ацэньвалі прэтэндэнтаў генеральны прадзюсар Белтэлерадыёкампаніі Глеб Шульман, выканаўчы прадзюсар праекта Вольга Шлягер, кіраўнік раніш няй праграмы «Добрай раніцы, Беларусь!» Алена Валяк, тэлевядучая і актрыса Святлана Бароўская, а таксама кампазітар і спявачка Ніна Багданава. Прадзюсарская група не толькі ацэньвала вакальныя здольнасці, але і задавала кожнаму пытанні, бо на шоу X-Factor вельмі важнай з'яўляецца і асабістая гісторыя кожнага чалавека.

Што да наступнага праслухоўвання, якое планавалі правесці ў Віцебску 4 красавіка, то яно, як паведамляе Белтэлерадыёкампанія, пераносіцца на нявызначаную дату ў сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй. Нагадаем, што ў вас яшчэ ёсць час запісаць сваё выкананне на відэа, а потым даслаць яго да завяршэння рэгіянальных перадкастынгаў па Viber на нумар +375-29-105-91-02 альбо праз Instagram (instagram.com/xfactorbelarus) і «Укантакце» (vk.com/xfactor_belarus). Падрабязную інфармацыю заўсёды можна знайсці ў афіцыйных акаўнтах шоу ў сацыяльных сетках.



**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 91

Аўтар сённяшняй задачы — В. Чарных *(гл. дыяграму)*.



**Белыя:** Крb5, Фd7, Се4, пп. d3, f2, f6 (6).
**Чорныя:** Кре5 (1).
Мат за 2 хады.

*Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10а, Мінск, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru*

***

Завяршыўся чэмпіянат Беларусі сярод шахматыстаў да 20 гадоў. У юнакоў сярод 10 удзельнікаў былі 2 міжнародныя майстры і 5 майстроў ФІДЭ. Перамог міжнародны майстар Міхаіл Нікіценка — 7,5 бала з 9 магчымых, другое месца заняў майстар ФІДЭ Дзяніс Лазавік — 7, трэцяе — міжнародны майстар Вячаслаў Зарубіцкі — 6,5.

Удзельнікі семінара-нарады, які нядаўна прайшоў у Магілёве на базе абласнога інстытута развіцця адукацыі, абмеркавалі вопыт работы такіх класаў, праблемы і перспектывы іх развіцця. Сваімі меркаваннямі на гэты конт падзяліліся прадстаўнікі Міністэрства сельскай гаспадаркі, устаноў вышэйшай адукацыі, выканаўчай і прадстаўнічай улады. За круглым сталом яны абмеркавалі, што трэба змяніць, каб прывабіць маладога чалавека на сяло, агучылі прапановы па ўдасканаленні нацыянальнага заканадаўства ў гэтай сферы.

— Пытанне ад падтрымцы развіцця сельскагаспадарчай галіны трэба вырашаць комплексна, — выказаў сваё меркаванне **член Савета Рэспублікі, прарэктар МДУ імя А. Куляшова Алег ДЗЯЧЭНКА.** — Інвестыцыі, набыццё тэхнікі, укараненне новых тэхналогій, вытворчасць высакаякаснай і экалагічна чыстай прадукцыі — гэта толькі адзін з аспектаў. Трэба таксама павышаць прывабнасць сельскіх прафесій за кошт стварэння для маладых умоў для пражывання і адпачынку, клапаціцца пра ўдасканаленне сацыяльна-эканамічнай і транспартнай інфраструктуры на сяле.

Парламентарый паабяцаў, што пасля абагульнення ўсе меркаванні, якія былі агучаны на семінары, будуць прапанаваныя ім для разгляду на ўзроўні Савета Рэспублікі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ЦІ МОЖНА ЗНАЙСЦІ КАМПРАМІС,

## і як скараціць тэрміны капітальнага рамонту



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

**Капітальныя рамонты часта прымаюць зацяжны характар. З такой з'явай сутыкнулася і гродзенка Антаніна Фёдараўна. У яе доме па вуліцы Леніна рамонт пачаўся ў сакавіку мінулага года і павінен быў скончыцца ў маі таго ж года. Канфлікты з камунальнымі службамі прывялі да таго, што жанчына ў лютым гэтага года вымушана была звярнуцца ў Камітэт дзяржкантролю Гродзенскай вобласці.**

Двухпавярховы дом па вуліцы Леніна абласнога цэнтра даўно чакаў рамонту. Антаніна Фёдараўна расказала, што нават старажылы, якія жывуць тут з часоў яго пабудовы, а гэта 1949 год, не памятаюць, каб на гэтым месцы штосьці рамантавалі. Вядома, жыхары не аднойчы звярталіся з гэтым пытаннем да гарадскіх улад, і не без падставы: дах у многіх месцах працякаў, у кватэрах з'яўлялася вільгаць. Неаднойчы здараліся лакальныя абвалы...

Нарэшце дайшла чарга і да яго. Адбылося гэта зусім нядаўна — летась будынак паставілі на капітальны рамонт. Здаецца, жыхары павінны радавацца. Але раптам высветлілася, што ім трэба вывезці мэблю і самім з'ехаць з кватэр. Пры гэтым падменным фондам людзей ніхто не забяспечваў. І хоць жыхары падрыхтавалі кватэры да рамонту, ён ніяк не пачынаўся.

— Так доўжылася больш за паўгода... А тут з ЖЭСа прыносяць прадпісанне, маўляў, тэрмінова вызваляйце памяшканні, здымайце нацяжныя столі, бо прыцягнем да адказнасці, атрымаеце штраф. Такое стаўленне жыхары палічылі, мякка кажучы, некарэктным і звярнуліся ў КДК Гродзенскай вобласці. Сітуацыя сапраўды хутка змянілася. А дакладней — рамонт пачаўся поўным ходам. Быў зроблены новы дах, столі падбілі гіпсакартонам, адрамантавалі фасад. Карацей, дом поўнасцю аднавіўся без усякага высялення, — расказвае Антаніна Фёдараўна.

Аказваецца, усё можна зрабіць, знайсці кампрамісныя рашэнні, а не ківаць на тое, што гэта, маўляў, праблемы не нашы, а жыхароў. Шкада толькі, што людзей пачулі толькі пасля звароту ў дзяржкантроль. Між тым падобных скаргаў у КДК Гродзенскай вобласці нямала. Сёлета іх колькасць павялічылася.

— Асабліва праблемная сітуацыя складваецца ў Гродне. Работы па замене даху, напрыклад, выконваюцца ў неспрыяльны перыяд, падчас дажджоў, што прыводзіць да заліцця памяшканняў і пашкоджання канструкцый самога будынка і жылых кватэр. Ёсць пытанні і па якасці рамонту, — акрэслівае сітуацыю **начальнік упраўлення КДК Гродзенскай вобласці Наталля ЖУР.**

Між тым аб'ёмы капітальнага рамонту растуць, канстатуюць у КДК. Гэта абумоўлена як высокай колькасцю жылых дамоў, пабудаваных 30-40 гадоў таму, так і патрабаваннямі кіраўніка дзяржавы. У прыватнасці ў адпаведнасці з Дырэктывай № 7 «Аб удасканальванні і развіцці жыллёва-камунальнай гаспадаркі» перад абласнымі ўладамі на 2020 год пастаўлена задача адрамантаваць 3 % жылога фонду, які знаходзіцца на балансе ЖКГ. Пры гэтым узятую планку ў далейшым зніжаць не дапускаецца. У КДК Гродзенскай вобласці праанілізавалі сітуацыю з капітальнымі рамонтамі за мінулы год. Аказалася, што многія жылыя дамы рамантуюцца не ў належны тэрмін. Значная колькасць жылых плошчаў засталася без аднаўлення. Было запланавана адрамантаваць 320 тысяч квадратных метраў, але здалі толькі 83 % ад даведзенага плана. Пры гэтым задан не не выканалі 10 арганізацый з 20. Рамонты, вядома, вядуцца, але далёка не ўсюды будынкі своечасова ўводзяцца ў эксплуатацыю. Напрыклад, такая сітуацыя летась склалася ў жыллёва-камунальных гаспадарках Зэльвенскага і Гродзенскага раёнаў.

У КДК звяртаюць увагу і на наступнае. Згодна са справаздачай планы па капрамонце выконваліся два папярэднія гады: у 2017-м і 2018-м. Прытым нават з невялікім плюсам. Праверкі ж выявілі, што тут не абышлося без прыпісак.

— Практыка справаздачнасці аб уводзе нібыта завершанага капітальнага рамонту працягваецца не першы год, — канстатуе Наталля Жур. — Але паўнаварTасны ўвод у эксплуатацыю падменьваецца па шэрагу будынкаў прыёмкай толькі першых пускавых комплексаў. Насамрэч планы ні ў 2017, ні ў 2018 годзе не выкананы.

На тое ёсць некалькі прычын. Як растлумачылі ў КДК, у план уключаюць аб'екты, па якіх не распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя альбо яна патрабуе карэкціроўкі на стадыі работ, у выніку чаго рамонт спыняецца да той пары, пакуль усё не вырашыцца. Акрамя гэтага, узнікаюць дадатковыя работы, якія прыводзяць да ўдаражэння аб'екта аж на 30 % ад першапачатковага кошту.

Пасля праверак у чатырох арганізацыях ЖКГ было выяўлена завышэнне кошту праектных, будаўніча-мантажных работ на агульную суму 110 тысяч рублёў. А ўсяго па вобласці завышэнне кошту на аб'ектах капітальнага рамонту жылога фонду складае амаль 700 тысяч рублёў. Гэтыя сродкі вернуты як у бюджэт, так і на спецыяльныя рахункі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

**У ТЭМУ**

**У Гродне капітальным рамонтам сёлета будзе ахоплена 140 дамоў. У адных рамонт толькі пачнецца, у другіх яго мяркуецца завяршыць. На гэтыя мэты плануецца патраціць каля 16 мільёнаў рублёў, большая частка якіх — адлічэнні грамадзян.**


**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛГАЗСТРОЙ» – управляющая компания холдинга»**

**Лот № 1, состав:** 1. Сооружение специализированное складов, хранилищ, инв. № 500/С-30309, 286,4 кв. м. 2. Сооружение специализированное складов, хранилищ, инв. № 500/С-28809, 481 кв. м. 3. Сооружение специализированное складов, хранилищ, инв. № 500/С-30308, 85 кв. м. 4. Здание специализированное иного назначения, инв. № 500/С-26575, 1040,3 кв. м. 5. Здание специализированное иного назначения, инв. № 500/С-28807, 1819,3 кв. м. 6. Склад ГСМ, инв. № 500/С-30757, 47,2 кв. м. 7. Ливневая канализационная сеть, инв. № 500/С-1026033, 724,3 кв. м. 8. Газопровод среднего давления, инв. № 500/С-1026034, 32,2 кв. м. 9. Хозяйственно-питьевая водопроводная сеть, инв. № 500/С-1026035, 459,9 кв. м. 10. Хозяйственно-бытовая канализационная сеть, инв. № 500/С-1026036, 395,1 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Гурского, 34/4, 34/2, 34/1, 34/ 3, 34, 34/5, 34 (КлК-1-КлК-23), 34 (здание - т.А), 34 (ВпК-1-ВпК-7), 34 (КбК-1-КбК-21). 11. Оборудование и механизмы (полный перечень приведен на сайте Организатора аукциона ino.by). Обремения: Аренда объектов недвижимости (полный перечень приведен на сайте Организатора аукциона ino.by). Земельный участок: кадастровый номер 500000000005008075, площадь – 2,1485 га. Право аренды (по 31.05.2038). Переход права осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь. **Начальная цена, бел. руб. с НДС** – 3 070 689,24. **Задаток, бел. руб.** – 307 068,92. Шаг аукциона – 5 %.

Размер штрафа, предусмотренного соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона, составляет 50 000,00 бел. руб.

**Аукцион состоится 15.04.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Продавец: ОАО «БЕЛГАЗСТРОЙ» – управляющая компания холдинга», 220030, г. Минск, ул. Советская, д. 4, тел. 8(017) 200-71-17. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 15.04.2020. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – **13.04.2020 в 11.00.** Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 25.01.2020.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**



**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Бархим» (Продавец), расположенного по адресу: г. Барановичи, ул. Проминского, 48/4**

**Лот № 1, состав:** 1. Склад-ангар «Модуль № 1», инв. № 110/С-85916, площадь 451,1 м². Составные части и принадлежности: отмостка, площадка подъездная, забор (ограждение). 2. Оборудование (полный перечень приведен на сайте Организатора аукциона ino.by). **Земельный участок:** площадь 0,2423 га, кадастровый номер 141000000003003745. Право аренды по 31.12.2049. **Начальная цена с НДС** – 150 000,00 руб. **Задаток** – 20 000,00 руб. **Шаг аукциона** – 5%. Размер штрафа в соответствии с соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона составляет 40 000,00 белорусских рублей.

**Аукцион состоится 23.04.2020 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 23.04.2020 (ОАО «Бархим», Лот № 1). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – **21.04.2020 в 11.00.** Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 05.11.2019.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) сообщает о внесении изменений в извещение по продаже имущества ОАО «Планар», опубликованное 02.04.2020**

Аукцион состоится **05.05.2020** в **15.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **04.05.2020** до **16.00** по указанному адресу. УНП 100104937.



**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже автомобиля GREAT WALL FLORID, принадлежащего учреждению образования «Борисовский государственный медицинский колледж»**

**Лот № 1:** 1. Легковой специальный хэтчбек, GREAT WALL FLORID, кузов (рама) № LGWED2A33AE638530, г. в. – 2010. 2. Комплект зимних шин (Belshina 195/65, 5 шт.), комплект летних шин (KAMA EURO 185/65, 5 шт., установлены на автомобиль). **Местонахождение:** г. Борисов, ул. Гагарина, д. 44. **Начальная цена** без учета НДС – 2 079,74 руб. **Задаток** – 300,00 руб. **Шаг аукциона** – 5 %.
**Условия аукциона**: 1. Заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 10 (десяти) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона (после предъявления Продавцу копии платежного документа об оплате Организатору аукциона стоимости затрат на организацию и проведение аукциона). 2. Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота: предоплата 100 % стоимости Лота.
3. Возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение аукциона на основании счета-фактуры в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты проведения аукциона.
Размер штрафа в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 составляет 1 000,00 белорусских рублей.

**Аукцион состоится 14.05.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.**

Полный текст извещения и порядок оформления участия в аукционе содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.
Продавец: Учреждение образования «Борисовский государственный медицинский колледж», г. Борисов, ул. Гагарина, д. 44, тел. 8 (01777) 62180. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 14.05.2020 (Борисовский государственный медколледж). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – **12.05.2020 в 11.00.** Контактное лицо для осмотра Объекта – Спивак Валерий Евгеньевич, тел./ф. 80177 76 21 81.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-59 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

# ІДЗЁМ ДА КЛІЕНТА!

## У Брэсцкай вобласці першымі ўкаранілі практыку выязных прыёмаў дзяржрэгістратараў

**Хто валодае нерухомай маёмасцю альбо ўчасткам зямлі, ведае, як важна мець адпаведныя дакументы на сваю ўласнасць. Цяпер пры набыцці, будаўніцтве, рэканструкцыі аб'екта дакументы афармляюцца адначасова з гэтым. А вось раней было не так. Асабліва часта праблемы з дакументамі ўзнікаюць у сельскай мясцовасці найперш, калі настае час уступіць у правы спадчынніка, прадаць, падарыць дом, участак. Тады людзі адразу звяртаюцца ў органы дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельнага кадастру. Бывае, што хадзіць туды даводзіцца не раз і не два. А калі ты жывеш не ў горадзе, гэта становіцца праблемай.**

### АПРАБАВАЛІ Ў ВЫСОКІМ

— Новую форму работы мы пачыналі ўкараняць восем гадоў таму, — расказвае **дырэктар Пружанскага філіяла РУП «Брэсцкае агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры» Аляксандр ПАПКОЎ.** — Тады структура прадпрыемства крыху адрознівалася. Мы ў якасці бюро ўваходзілі ў Бярозаўскі філіял, адным з падраздзяленняў было таксама Камянецкае бюро. Камянецкі раён вялікі, і, скажам, горад Высокае знаходзіцца амаль за паўсотні кіламетраў ад райцэнтра. Некаторым жыхарам вёсак высокаўскай зоны зручней было дабірацца ў Каменец праз Брэст, а гэта круг — амаль у сто кіламетраў. Вядома, людзі пісалі скаргі ў самыя розныя інстанцыі. Аднойчы мы разам з тагачасным старшынёй Камянецкага райвыканкама Андрэем Пісарыкам разглядалі тыя скаргі і меркавалі, якое выйсце можна знайсці з сітуацыі. Менавіта Андрэй Мікалаевіч прапанаваў аказваць паслугі па рэгістрацыі на месцы, у Высокім.

На месцах мы працуем з мясцовымі органамі ўлады. Без іх падтрымкі ў нас проста не атрымалася б арганізаваць работу на належным узроўні.

Арганізацыйна гэта аказалася не так проста. Рэгістратар мае справу з канфідэнцыяльнай інфармацыяй грамадзян, адразу ж паўстала пытанне абароны гэтай інфармацыі. Давялося папрацаваць праграмістам, стварыць адмысловыя праграмы па абароне электроннай базы і спосабаў карыстання інфармацыяй. З часам былі набытыя камп'ютары, шматфункцыянальныя прылады для друку, 3G-мадэмы, былі забяспечаны аддалены доступ у нашу базу даных і абарона канала сувязі. І рэгістратар пачаў прымаць грамадзян раз на месяц у горадзе Высокае. Высокаўскі гарвыканкам паспрыяў з памяшканнем для работы — яго адвялі ў будынку гарсавета.

Спецыяліст вёў прыём як па папярэднім запісе, так і па жывой чарзе. Папярэдні запіс дазваляе рэгістратару падрыхтаваць неабходны пакет дакументаў яшчэ да выезду, а гэта істотна скарачае час абслугоўвання кліента. Доступ жа да рэсурсаў лакальнай сеткі прадпрыемства, да ўсіх праграм і дакументаў дазволіў ажыццяўляць усе рэгістрацыйныя дзеянні у адносінах аб'ектаў нерухомасці, выдаваць пасведчанні аб рэгістрацыі здзелак, даведкі і іншую інфармацыю, даваць кваліфікаваныя кансультацыі па пытаннях рэгістрацыі нерухомай маёмасці. Пры неабходнасці супрацоўнік звязваецца па скайпе з работнікамі архіва бюро альбо філіяла для прагляду дадатковых архіўных дакументаў.

— Адным словам, мы адпрацавалі пробны варыянт на Высокім і ўпэўніліся, што выбралі правільны кірунак, — адзначае Аляксандр Папкоў.

### ПРЫКЛАД ДЛЯ ПЕРАЙМАННЯ

Тады Пружанскае бюро ўзялося за работу ў сваім раёне. Там, як і ў Камянецкім, ёсць былыя райцэнтры, значна аддаленыя ад горада. Скажам, Ружаны размешчаны на адлегласці 45 кіламетраў ад Пружан, да Шарашэва больш за 20 кіламетраў. Жыхарам гэтых пасёлкаў трэба было траціць цэлы рабочы дзень, каб толькі прыехаць і падаць дакументы. Значную дапамогу ў арганізацыі аказаў тагачасны старшыня Пружанскага раённага Савета дэпутатаў Віктар Макарэвіч. У Ружанскім і Шарашоўскім выканкамах былі адведзены рабочыя месцы для рэгістратараў. Паступова наладзілі супрацоўніцтва з дзяржаўнымі натарыяльнымі службамі, цяпер яны абавязкова выязджаюць сумесна і вядуць прыёмы грамадзян. І ўжо за першы год работы на Пружаншчыне было праведзена 117 прыёмаў, на кожны з іх прыходзіла па 15-20 жыхароў найбліжэйшых населеных пунктаў. Людзям стала зручна, паступова работа прыйшла ў сістэму. Скажам, за мінулы год рэгістратары Пружанскага філіяла правялі 84 выязныя прыёмы, падчас якіх прынята 917 заяў на рэгістрацыю, інвентарызацыю і праверку тэхнічных характарыстык.

Вопыт першых гадоў работы быў заўважаны. У Пружаны прыехалі кіраўнікі і спецыялісты Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага кадастравага агенцтва, Банка развіцця РБ, які пазней паспрыяў развіццю гэтай формы абслугоўвання. І было прынята адназначнае рашэнне па пераймannі вопыту ў краіне. А прадстаўнікі банка назвалі праграму «Кліенцкі падыход», што азначае — ісці да кліента, а не чакаць яго ў сябе ў офісе.

— Мы не толькі прымаем сваіх наведвальнікаў, скажам, у Ружанах, — удакладняе Аляксандр Іванавіч. — На наступным тыдні работнік сам выязджае ў Зеляневічы да інваліда, каб аформіць здзелку. Вёска Зеляневічы знаходзіцца прыблізна за 15 кіламетраў ад Ружан. Плануем набыць асобную машыну, для таго каб яна працавала як перасоўны пункт рэгістрацыі.

### ЛЮДЗЯМ СТАЛА ЗРУЧНЕЙ

— Пружаны былі піянерамі ў гэтай справе, — адзначае **дырэктар Брэсцкага агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры Васіль ХАЛАДЦОЎ.** — Пасля іх сталі паспяхова ўкараняць выязныя прыёмы іншыя філіялы як у вобласці, так і ў краіне. Цяпер нашы рэгістратары па графіку працуюць у Целяханах Івацэвіцкага раёна, у Дамачаве Брэсцкага раёна. У Белаазёрску Бярозаўскага раёна спачатку наладзілі выязны прыём, цяпер там працуе стацыянарны пункт. Вядома, гэта дае свае вынікі. Людзям стала зручней, яны прывыклі да такой практыкі, ім патрэбная наша паслуга на месцы. Пра апошняе сведчыць і такі факт. Мы хацелі на наступным тыдні адмяніць выязны прыём у Дамачаве ў сувязі з эпідэмічнай сітуацыяй. Думалі, наведвальнікі самі не прыйдуць. Але пазваніў старшыня сельскага Савета і сказаў, што грамадзяне актыўна запісваюцца. Значыць, прыём адбудзецца.

На месцах мы працуем з мясцовымі органамі ўлады. Без іх падтрымкі ў нас проста не атрымалася б арганізаваць работу на належным узроўні.

Ужо некалькі гадоў у Дамачаве прыёмы вядзе супрацоўнік Брэсцкага агенцтва Дзмітрый Астаповіч. Дзмітрый Мікалаевіч адзначыў, што на прыём прыходзяць людзі з двух самых аддаленых сельсаветаў — Дамачаўскага і Тамашоўскага:

— Даводзіцца не толькі рэгістраваць і выдаваць дакументы, але і даваць кансультацыі вясковым людзям. Многія жылыя дамы, узведзеныя ў першай палове або сярэдзіне мінулага стагоддзя, не маюць ніякіх дакументаў. А калі жаданне ўступіць у спадчыну выказваюць унукі альбо праўнукі былых гаспадароў, цяжка бывае даказаць іх правы. Грамадзянам даводзіцца звяртацца ў суд, шукаць хоць якія зачэпкі ў архіўных звестках. На жаль, у былыя часы афармленню нерухомасці не ўдзялялі патрэбнай увагі, як і дакументам па зямельных надзелах. З апошнімі яшчэ больш праблем, калі няма дакументаў на межы ўчасткаў. І ўсё гэта даводзіцца рабіць, наганяць упушчанае. Так што рэгістрацыя — справа сур'ёзная, яе трэба праводзіць своечасова.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**



**Выязны прыём у Шарашэве вядзе рэгістратар Аксана ГАЎРА *(справа)*.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Березинский льнозавод» проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества в составе:**

**Лот № 1:** главный производственный корпус общей площадью 3765,8 кв. м, инв. № 611/С-32645, расположенный на земельном участке площадью 1,5960 га с кадастровым номером 620450100001003603 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60, корп. 1.

Начальная цена с НДС (20 %) – **428 688,00 бел. руб**. Задаток 5 % от начальной цены (**21 434,40 бел. руб.**).

**Лот № 2:** административно-бытовой корпус общей площадью 1630,5 кв. м, инв. № 611/С-32540, расположенный на земельном участке площадью 0,2716 га с кадастровым номером 620450100001003599 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.

Начальная цена с НДС (20 %) – **196 259,70 бел. руб.** Задаток 5 % от начальной цены (**9 812,98 бел. руб.**).

**Лот № 3:** склад-арочник общей площадью 772 кв. м, инв. № 611/С-32657, расположенный на земельном участке площадью 0,1541 га с кадастровым номером 620450100001003594 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60, корп. 4.

Начальная цена с НДС (20 %) – **94 452,00 бел. руб.** Задаток 5 % от начальной цены (**4 722,60 бел. руб.**).

**Лот № 4:** склад-арочник общей площадью 651,7 кв. м, инв. № 611/С-32658, расположенный на земельном участке площадью 0,1659 га с кадастровым номером 620450100001003595 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60, корп. 3.

Начальная цена с НДС (20 %) – **73 554,00 бел. руб.** Задаток 5 % от начальной цены (**3 677,70 бел. руб.**).

**Лот № 5:** здание котельной общей площадью 947,2 кв. м, инв. № 611/С-32655 и кастросборник общей площадью 151,8 кв. м, инв. № 611/С-32801, расположенные на земельном участке площадью 0,4438 га с кадастровым номером 620450100001003597 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.

Начальная цена с НДС (20 %) – **130 872,00 бел. руб.** Задаток 5 % от начальной цены (**6 543,60 бел. руб.)**.

**Лот № 6:** автовесовая общей площадью 193,2 кв. м, инв. № 611/С-32800, расположенная на земельном участке площадью 0,0435 га с кадастровым номером 620450100001003598 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60, корп. 10.

Начальная цена с НДС (20 %) – **31 896,00 бел. руб.** Задаток 5 % от начальной цены (**1 594,80 бел. руб.**).

**Лот № 7:** блок вспомогательных помещений общей площадью 515,2 кв. м, инв. № 611/С-32646 и навесной склад общей площадью 309,4 кв. м, инв. № 611/С-32804, расположенные на земельном участке площадью 0,5540 га с кадастровым номером 620450100001003596 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.

Начальная цена с НДС (20 %) – **110 790,00 бел. руб.** Задаток 5 % от начальной цены (**5 539,50 бел. руб.**).

**Лот № 8:** насосная станция 2-го подъема общей площадью 101,5 кв. м, инв. № 611/С-32802, расположенная на земельном участке площадью 0,7992 га с кадастровым номером 620450100001003592 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.

Начальная цена с НДС (20 %) – **37 662,00 бел. руб**. Задаток 5 % от начальной цены (**1 883,10 бел. руб.**).

**Лот № 9:** шоха № 1 общей площадью 3448 кв. м, инв. № 611/С-32654, шоха № 2 общей площадью 3442 кв. м, инв. № 611/С-32653 и подвальное помещение общей площадью 70,5 кв. м, инв. № 611/С-32803, расположенные по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.

Начальная цена с НДС (20 %) – **318 042,00 бел. руб.** Задаток 5 % от начальной цены (**15 902,10 бел. руб.**).

**Стоимость лотов снижена на 50 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

*Предыдущие извещения опубликованы в газете «Белорусская Нива» («Сельская газета») 07.09.2017, 07.12.2017 и «Звязда» от 23.04.2018, 19.12.2018, 12.03.2019, 05.09.2019, 17.12.2019.*

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (с изменениями и дополнениями).

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by**. Аукцион состоится **16.04.2020** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.04.2020** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.** УНП 690657149



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Старобинский» (продавец), проводит открытый аукцион**

**ПО ПРОДАЖЕ АДМИНИСТРАТИВНОГО ЗДАНИЯ**

**с инв. № 644/С-57945 общей площадью 231,7 кв. м, расположенного на земельном участке (*право постоянного пользования*) с кадастровым номером 625086202501000268 площадью 0,2191 га по адресу: Минская область, Солигорский район, Старобинский с/с, д. Саковичи, ул. Залужная, 2В.**

*Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: ограничения прав на земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов, пл. 0,2191 га; охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0063 га.*

**Начальная цена с НДС (20 %) – 33 960,00 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены (3 396,00 бел. руб.).**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **06.05.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.05.2020** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.** УНП 600071171.

РУП «Институт недвижимости и оценки»
извещает о проведении открытого аукциона
по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «БЕЛТЕПЛОИЗОЛЯЦИЯ»**
на праве собственности

**Лот №1, состав**: 1. Склад, инв. № 450/С-19090, 66,0 кв.м, г. п. – 1975. 2. Склад, инв. № 450/С-19091, 179,0 кв. м, г. п. – 1975. 3. Склад, инв. № 450/С-19092, 120,0 кв. м, г. п. – 1999. 4. Гараж, инв. № 450/С-19088, 129,0 кв. м, г. п. – 1975. 5. Административное здание, инв. № 450/С-19086, 247,3 кв. м, г. п. – 1975. Составные части и принадлежности: четыре ограждения, ворота, два покрытия. 6. Навес, инв. № 450/С-19104, 236,0 кв. м, г. п. – 1975. 7. Навес, инв. № 450/С-19108, 645,0 кв. м, г. п. – 1975. 8. Навес, инв. № 450/С-19109, 432,0 кв. м, г. п. – 1975. Адрес: Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Брестская, д. 141.

**Начальная цена с НДС** – 192 000,00 руб. **Задаток –** 19 200,00 руб. **Шаг аукциона** – 5 %. **Штраф** – 2 000,00 руб.

Земельный участок 425450100000001777 площадью 0,5819 га. Целевое назначение – земельный участок для строительства и обслуживания производственной базы. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

**Условия аукциона:** 1. Подписать с Продавцом договор купли-продажи в течение 3 (трех) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона (после предъявления Продавцу документа, подтверждающего оплату вознаграждения Организатору аукциона). 2. Оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе Лота № 1 в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней с момента подписания договора купли-продажи. 3. Оплатить Организатору аукциона вознаграждение в размере 2 % от цены продажи Лота №1 в течение 3 (трех) банковских дней с назначенной даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 07.05.2020 в 11.00 по адресу:
г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4**

Полный текст извещения и порядок оформления участия в аукционе содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.
**Продавец:** ОАО «БЕЛТЕПЛОИЗОЛЯЦИЯ», г. Минск, пер. Бехтерева, 12, 8 (017) 291-32-79. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе ОАО «БЕЛТЕПЛОИЗОЛЯЦИЯ» 07.05.2020. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – **05.05.2020 в 11.00.** Контактное лицо для осмотра Объекта – Федоринчик Владимир Григорьевич, +375 (29) 665-75-47

☎ **Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ
ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА
**ОАО «Рогознянский»**

**Предмет торгов – Лот:** капитальное строение с инвентарным номером 101/С-8305 (наименование: двухэтажное кирпичное производственное здание; назначение: здание специализированное иного назначения) площадью 1048,3 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Ленинский с/с, д. Чижевщина, ул. Центральная, 87/1, на земельном участке с кадастровым номером 122581505102000005, площадью 1,9399 га.
Составные части и принадлежности: уборная, сарай, котельная

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 33 645,00 | Размер задатка, руб. | 3 364,50 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Рогознянский», 225111, Брестская обл., Жабинковский р-н, аг. Ленинский, ул. Ленина, 14. Тел./ф. 80164165133. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».
**Реквизиты для перечисления задатка:**
р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк»
Региональная дирекция № 100 по Брестской области,
BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245.
**Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20-и рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. **Условия оплаты:** в соответствии с заключенным договором купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также вознаграждение Организатору аукциона (в течение 3-х рабочих дней со дня подписания протокола аукциона). **Условия продажи:** без условий. **Обременения:** наличие действующих договоров аренды.

**Аукцион состоится 16 апреля 2020 г. в 11.00
по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, а также иную информацию можно узнать у организатора аукциона по телефонам 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81, 8-(029) 626-72-52

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:
г. Брест, ул. Наганова, 10, 329, в рабочие дни с 9.00 до 17.00

**Последний день приема заявлений – 15 апреля 2020 г. до 17.00**

Ранее извещение о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «Рогознянский» опубликовано в газете «Звязда» от 18.02.2020.

**ИНФОРМАЦИЯ**
**о существенных фактах (событиях, действиях)**
Открытое акционерное общество
«Управление механизации № 79»
Местонахождение – г. Минск, ул. Селицкого, д. 27А

26 марта 2020 года общим собранием акционеров ОАО «УМ № 79» принято решение о выплате дивидендов по акциям.

Размер начисленных дивидендов за 2019 год на одну простую (обыкновенную) акцию составляет – 0,1199 рубля.
Период выплаты дивидендов – с 20 апреля по 25 мая 2020 года.
Порядок выплаты дивидендов:
- акционерам – работникам Общества – выплата производится одновременно с выплатой заработной платы;
- акционерам – не работникам Общества – выплата дивидендов производится почтовым переводом;
- Управляющей компании холдинга «БЕЛСТРОЙЦЕНТР-ХОЛДИНГ» выплата дивидендов производится путем перечисления на расчетный счет по 22 апреля 2020 года.

УНП 100090613




# Гарадок для птушак

**Семукачы — аграгарадок Магілёўскага раёна, дзе жыве шмат ініцыятыўных і актыўных людзей. З прапановай зрабіць птушыны гарадок да старшыні Семукацкага сельвыканкама Тамары УКРУЖСКАЙ звярнуўся настаўнік працоўнага навучання Іван СТРЫКУНОЎ.**

Маўляў, цяпер хлопцы і дзяўчаты вучацца майстраваць шпакоўні і маглі б зрабіць карысную справу для сваёй малой радзімы. Старшыня падтрымала прапанову, дапамагла будаўнічымі матэрыяламі. З іх вучні пад кіраўніцтвам настаўніка зрабілі 21 шпакоўню. Усе гэтыя дамкі яны размясцілі на адным дрэве ў парку каля школы.

Добрую ініцыятыву падхапілі работнікі семукацкага ўчастка жылкамгаса і змайстравалі для птушынага гарадка яшчэ і лаўкі, якія ўстанавілі каля дрэва са шпакоўнямі.

— Птушкі, дарэчы, пачалі ўжо спраўляць наваселлі, і назіраць за гэтым — адно задавальненне, — радуецца Тамара Укружская. — Важна, што людзі самі праявілі ініцыятыву, а не чакалі, калі хтосьці прыйдзе і папросіць іх гэта зрабіць. Прыемна ведаць, што нашым жыхарам зусім не ўсё роўна, як выглядае тое месца, дзе яны жывуць. Разам проста зрабіць наш агульны дом больш утульным і прывабным.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**



Фота Тамары УКРУЖСКАЙ.

ПАМЯЦЬ

# ГЭТА ТРЭБА ЖЫВЫМ

## У Мінскім раёне наводзяць парадак на могілках талакой

**Па апошнім папярэднім перапісе ў Мінскім раёне жыве 250 тысяч чалавек. На тэрыторыі раёна знаходзяцца горад раённага падпарадкавання, пасёлак гарадскога тыпу і 18 сельсаветаў. У некаторых садовых таварыствах, а іх налічваецца 312, людзі жывуць круглы год. Падчас дачнага сезона колькасць насельніцтва яшчэ павялічваецца. Па аўтатрасах, чыгунцы, якія праходзяць па тэрыторыі раёна, няспынна рухаецца транспарт...**

Упарадкаваннем тэрыторый, навядзеннем парадку ў раёне займаюцца, так бы мовіць, талакой. У прыватнасці, працуюць разам райвыканкам і райсавет дэпутатаў. Яшчэ пры былым старшыні райвыканкама Іване Крупко ўвялі новую форму работы, якую працягваюць і цяпер.

— Кожны аўторак на апаратнай нарадзе заслухоўваецца работа аднаго з сельскіх Саветаў дэпутатаў па розных кірунках дзейнасці, у тым ліку і па навядзенні парадку на падначаленых тэрыторыях. Папярэдне на месца выязджаюць прадстаўнікі землеўпарадкавальнай, архітэктурнай, экалагічнай, санітарнай службаў, спецыялісты сельскай гаспадаркі. Яны абследуюць тэрыторыю, выяўляюць недахопы і падчас нарады дэманструюць адпаведныя слайды. Напрыклад, у нейкай юрыдычнай асобы беспарадак на тэрыторыі або побач. Выдаецца прадпісанне праз канкрэтны прамежак часу выправіць становішча. А на наступнай нарадзе яны ў рэжыме анлайн дэманструюць фотаздымкі, якія павінны сведчыць, што ўсе хібы ліквідаваны. З домаўладальнікамі працуюць старшыні сельвыканкамаў, акрамя таго, за кожнай юрыдычнай асобай яны замацоўваюць канкрэтную тэрыторыю, дзе трэба навесці парадак, — расказвае **старшыня раённага Савета дэпутатаў Юлія БЯЛЯНКІНА.**

Асаблівая ўвага звяртаецца на добраўпарадкаванне грамадзянскіх могілак, якіх у раёне 120, а таксама помнікаў воінам, загінулым у гады Вялікай Айчыннай вайны, брацкіх магіл. Такіх налічваецца 124.

— Мы добраўпарадкуем гэтыя пахаванні не толькі напярэдадні праваслаўных або дзяржаўных свят. Работа па навядзенні парадку тут вядзецца пастаянна, — працягвае Юлія Бялянкіна. — Сёлета ўмовы надвор'я дазвалялі гэтым займацца круглы год. У прыватнасці, правялі інвентарызацыю дрэў. Тыя, што неслі пагрозу помнікам, агароджам, ды і самім людзям, якія наведвалі памерлых сваякоў, зрэзалі. Старшыні сельвыканкамаў разам з майстрам участка аб'ехалі ўсе могілкі, якія знаходзяцца на іх тэрыторыі. Падчас абследавання яны пакідаюць наведвальнікам памяткі з тлумачэннем, куды звяртацца па пытаннях выдзялення месца для пахавання, з просьбай захоўваць чысціню, не выкідваць смецце на суседнія магілы, у праходы.

На кожных могілках усталяваны кантэйнерныя пляцоўкі або адведзены спецыяльныя месцы, куды можна выкідваць лісце, вянкі і г. д. Спецыялісты сочаць, каб ёмістасці не перапаўняліся, а адходы вывозіліся па графіку.

Што датычыцца брацкіх пахаванняў, то кожнае з іх замацавана за прадпрыемствам, арганізацыяй. Калі старшыня сельвыканкама бачыць, што тут неабходна нешта падправіць, падрамантаваць, падфарбаваць, то пісьмова звяртаецца па дапамогу да суб'ектаў гаспадарання. Яны выступаюць як спонсары, за свой кошт наводзяць глянец. Даглядаюць магілы і школы: вучні і настаўнікі прыбіраюць смецце, высаджваюць кветкі.

— Ніводная арганізацыя ніколі не адмовіла ў дапамозе, — сцвярджае Юлія Бялянкіна.

— Юлія Іванаўна, у некаторых раёнах грамадзянскія могілкі перададзены на баланс жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Ці не цяжка сельвыканкамам іх абслугоўваць — для гэтага ж патрэбны сродкі, спецыяльная тэхніка? — пацікавілася ў старшыні.

— Грамадзянскія могілкі ў нашым раёне знаходзяцца на абслугоўванні сельвыканкамаў. Толькі двое могілак у Заслаўі абслугоўваюцца ЖКГ. Раней пры сельвыканкамах працавалі камунальныя ўнітарныя прадпрыемствы (КУПы), якія займаліся добраўпарадкаваннем. Летась пасля рэарганізацыі іх перадалі УП «Мінскрайгаррамаўтадар», на базе КУПаў створана шэсць участкаў, якія адказваюць за парадак на тэрыторыі сельсавета, у тым ліку і на могілках. Што да фінансавання, то ў адпаведнасці з пастановай Міністэрства ЖКГ № 126 фінансаванне крыху змянілася, заказчыкам усіх паслуг з'яўляецца райвыканкам.

— І ўсё ж з праблемамі сутыкаецеся?

— Не скажу, што з нейкімі вялікімі праблемамі. Калі яны ўзнікаюць, старшыні сельвыканкамаў іх агучваюць. У прыватнасці, на некаторых могілках не хапае месцаў для пахавання. Можна падзахоўваць людзей на закрытых могілках да сваіх родных. Але не ўсе пагаджаюцца — нашы людзі прывыклі, каб было выдзелена больш месца. Сітуацыю ў любым выпадку стараемся вырашыць разам.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**


МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15
ад 17 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 2 красавіка 2020 года.